Сямейная газета



**Віншуем пераможцаў конкурсаў!**



**Школа здароўя для пенсіянераў**



**Калі згарэў дом...**

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 СТУДЗЕНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 17 (28633)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Таццянін дзень



**У філіяле Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта — Барысаўскім дзяржаўным політэхнічным каледжы — выкладаюць і навучаюцца не меней за дзесяць Таццян. Учора, перад іхнім святам, мне пашанцавала разам сфатаграфаваць пяцярых: трэццякурсніц Таццяну КАВАЛЬЧУК і Таццяну ХАДНЕВІЧ, выкладчыцу фізвыхавання Таццяну КУЖАЛЬ і майстра вытворчага навучання Таццяну ТЫШКЕВІЧ, а таксама бібліятэкара Таццяну ШЛОКАВУ.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый МУРЫН, начальнік галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу Нацыянальнага банка:**

*«Паўтарэння мінулага года, калі стаўка рэфінансавання і іншыя стаўкі зніжаліся дастаткова хутка, чакаць не варта, хоць магчымасці для далейшага зніжэння стаўкі рэфінансавання і ставак на крэдытным і дэпазітным рынках застаюцца і сёлета. Але тэмпы будуць значна ніжэйшыя. На наш погляд, пралічваецца, што стаўка рэфінансавання можа быць зніжана да 9,5—10,5 % гадавых у залежнасці ад таго, як будзе складвацца макраэканамічная сітуацыя ў краіне. Нацыянальны банк Беларусі працягне праводзіць тую грашова-крэдытную палітыку, якую праводзіў папярэднія тры гады».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.01.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9802 | ▲ |
| Еўра | 2,4394 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0351 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0687 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

## ■ Карані

# Шляхамі Эдварда Вайніловіча

## Краязнавец Ірына Шкуцька распавяла пра вядомага земляка

**Да Эдварда Вайніловіча цікавасць сталі праяўляць гісторыкі, журналісты ды і простыя грамадзяне, бадай, толькі ў апошнія гады. Пра гэтага неардынарнага чалавека, буйнога землеўладальніка, грамадскага і палітычнага дзеяча, асветніка, мецэната шмат пішуць. На маім шляху сустрэлася цудоўная жанчына, настаўніца біялогіі з Цімкавіцкай сярэдняй школы Капыльскага раёна, краязнавец Ірына Шкуцька, якая не толькі з гістарычных крыніц даведалася пра жыццё знакамітага земляка.**

Ірына Яўгенаўна вучылася ў Мінскім педагагічным інстытуце імя Горкага (цяпер гэта Беларускі дзяржаўны педуніверсітэт імя Максіма Танка). З вокнаў навучальнай установы добра бачны касцёл Святых Сымона і Алены, або, як яго называюць, Чырвоны касцёл. Дзяўчына ведала, што касцёл пабудаваў Эдвард Вайніловіч у гонар сваіх рана памерлых дзяцей. Пра гэта і пра тое, якую ролю адыграў ён у лёсе іх сям'і, расказвала ёй бабуля Вольга Пятроўна, якая нарадзілася ў 1895 годзе ў вёсцы Савічы, дзе былў радавы маёнтак Эдварда Вайніловіча. А яе муж, дзядуля Ірыны Яўгенаўны, Іван Мікітавіч Місевіч, з'явіўся на свет у 1890-м у суседняй вёсцы Браткава, якой таксама валодаў Вайніловіч.

— Бабуля гадоў з дзесяці разам з дзяўчатамі і жанчынамі працавалі тут на палетках: саджалі бульбу, жалі збажыну. Пасля працы яны прыходзілі ў панскі двор па разлік. Калі пана не было дома, то з імі расплачваўся аканом. Апошнія гады загадваў гаспадаркай Дзмітрый Шкуцька (такое прозвішча па мужу і ў мяне). Ён распараджаўся, як цяпер кажуць, «фронтам работ»: колькі жанчын і мужчын куды паслаць. Бабуля Вольга ўспамінала: неяк прыйшлі ў поле, ды пачалася бура, грымнула навальніца — жаць было нельга. Вайніловіч загадаў адправіць жней дадому, але разлічыцца з імі толькі за тое, што выйшлі на ніву. Кожная атрымала па пяць капеек. На тыя часы за гэтыя грошы можна было купіць цукерак або простую паркалёвую хустку, — распавяла мая суразмоўніца.

СТАР. 13

## ■ На слыху

# НЯЛАСКАВЫ ЗВЕР



## Хворы на шаленства сабака кантактаваў з дзясяткам чалавек

**У студзені ў Мінску акалеў хворы на шаленства сабака пароды кане-корса. Дагэтуль некалькі дзён ён блукаў па горадзе. Аб тым, наколькі небяспечная гэта інфекцыя і якія меры прымаць, каб пазбегнуць заражэння, мы пагутарылі з загадчыкам хірургічнага аддзялення 31-й гарадской паліклінікі г. Мінска Верай БАГАНЁВАЙ.**

— Тое, што ў 2018 годзе па мегаполісе некалькі дзён ходзіць шалёны сабака — шакіруючы выпадак. Сітуацыя развівалася наступным чынам. Па інфармацыі санстанцыі, сабаку знайшлі на вуліцы Альшэўскага ў Фрунзенскім раёне сталіцы, — расказвае Вера Баганёва. — У гэты ж дзень мужчына перадаў яго знаёмым на вуліцу Інтэрнацыянальную. Адтуль яго аддалі грамадзянам са Слуцка. Там сабака пачаў паводзіць сябе агрэсіўна, напаў на аднаго з членаў сям'і. Гаспадары збіраліся прывезці яго ў прытулак на вуліцы Гурскага. Мяркуецца, што яны выпусцілі яго дзесьці ў Кастрычніцкім раёне сталіцы. Тры дні сабака блукаў там у намордніку. 11 студзеня яго ўзяла адна жыхарка раёна, потым перадала іншай. 13 студзеня сабака апынуўся ў трэцяй сям'і. Ён добра сябе адчуваў, быў ласкавы, а 17 студзеня стаў агрэсіўны, з'явіліся сутаргі, пена з рота, і сабака акалеў. 18 студзеня падчас ускрыцця высветлілася, што ў сабакі было шаленства. Уявіце, якая колькасць толькі ўстаноўленых кантактаў адбылася з хворай жывёлай! На гэтыя раёны, дзе пабываў сабака, накладзены каранцін. Усе хатнія жывёлы там павінны быць прышчэплены ад шаленства. Асобы, якія кантактавалі з сабакам, атрымліваюць антырабічныя прышчэпкі.

СТАР. 4

■ З першых вуснаў

# НА ВАРЦЕ ПРЫРОДНЫХ БАГАЦЦЯЎ

## 33 тысячы гектараў лесу і 360 кіламетраў рэк на кожнага інспектара

**«За 15 гадоў у грамадстве сфарміравалася адназначна негатыўнае стаўленне да браканьерства», — начальнік Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслиннага свету пры Прэзідэнце Сяргей НОВІКАЎ лічыць гэта адным з важных дасягненняў службы, якую ён узначальвае.**



— Усе ўжо зразумелі, што рэсурсы — абмежаваныя, і тыя, хто бяруць незаконна, па сутнасці, крадуць у астатніх, — тлумачыць начальнік Дзяржінспекцыі непрыняцце ў грамадстве тых, хто незаконна палюе ці рыбачыць.

210 тысяч парушэнняў у сферы палявання, рыбалоўства і лесакарыстання было выяўлена за 15 гадоў існавання Дзяржінспекцыі. За той жа перыяд было канфіскавана 176 тысяч сетак даўжынёй 8,5 тысячы кіламетраў, 325 электралавільных прылад, 60 тысяч іншых забароненых прылад лоўлі, каля 2600 адзінак незарэгістраванай зброі, амаль 200 тон незаконна вылаўленай рыбы і столькі ж мяса дзічыны.

Сяргей Новікаў канстатаваў, што апошнім часам назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да зніжэння агульнай колькасці парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства: у 2016 годзе іх было 9,7 тысячы, а летась — 8,5 тысячы, што на 12 % менш. Калі ж прыгадаць першыя гады работы інспекцыі, тады выяўлялася 20—25 тысяч парушэнняў штогод!

Многія ўжо ведаюць, што браканьерства — вельмі дарагое задавальненне: сумы кампенсацыі шкоды за незаконна здабытых звяроў і рыбу, ссечаныя дрэвы нярэдка вылічваюцца тысячамі рублёў. Акрамя таго, па рашэнні суда ў парушальнікаў канфіскуюцца транспартныя сродкі. Летась у браканьераў канфіскавалі 19 аўтамабіляў, а таксама 111 маламерных суднаў і 8 лодачных матораў.

Калі парушэнні здзяйсняюць службовыя асобы, Дзяржінспекцыя хадайнічае перад іх наймальнікамі аб прыцягненні гэтых супрацоўнікаў яшчэ і да дысцыплінарнай адказнасці. За 2017 год такім чынам было пакарана 775 службовых асоб.

Не пакінуць па-за ўвагай і тых, хто без дазволу высякае лес. Летась дзяржінспектары выявілі больш за 3000 парушэнняў правілаў лесакарыстання і ўстанавілі 405 фактаў транспарціроўкі драўніны ў парушэнне дзеючага парадку. За гэтымі лічбамі крыюцца эканамічныя страты для бюджэту краіны.

— Празрыстасць працэса нарыхтоўкі магла б забяспечыць электронная сістэма ўліку і транспарціроўкі драўніны, — лічыць Сяргей Новікаў. Паводле яго слоў, летась Мінлясгас распачаў рэалізацыю праекта па ўкараненні Адзінай дзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы на базе трох лясгасаў (Гродзенскага, Драгічынскага і Уздзенскага). Калі вопыт будзе станоўчы, то электронная сістэма да 2021 года будзе ўкаранёная паўсюдна.

У 2017 годзе па даручэнні Прэзідэнта Дзяржінспекцыя займаліся таксама выяўленнем сельскагаспадарчых земляў, якія выкарыстоўваюцца нерацыянальна, гэта значыць, зараслі хмызняком, хоць па прызначэнні з'яўляюцца ворнымі і лугавымі. Аказалася, што 5,6 тысячы гектараў зямель сельгаспрызначэння знаходзяцца ў стадыі дэградацыі.

Свой унёсак у ахову прыроды Дзяржінспекцыя робіць таксама і праз агучванне ініцыятыў.

— У апошнія гады мы пастараліся надаць імпульс зарыбленню вадаёмаў і рэк, — кажа Сяргей Новікаў — У прыватнасці, па дамоўленасці з расійскімі калегамі і Беларускім таварыствам паляўнічых і рыбаловаў цягам усяго мінулага года праводзіліся сумесныя мерапрыемствы па аднаўленні рыбных запасаў Дняпра, дзе ў жніўні 2016 года адбыўся масавы замор рыбы. На трансгранічным участку ракі ў Дубровенскім і Смаленскім раёнах было выпушчана ў раку больш за 40 тысяч асобін рознаўзроставых малькоў рыб — шчупака, сцерлядзі, сазана. У планах на гэты год — зарыбленне Дняпра судаком.

Таксама па ініцыятыве Дзяржінспекцыі былі ўнесены змяненні ў тэхнічныя рэгламенты, і ўздоўж буйных магістраляў стала з'яўляцца агароджа, якая перашкаджае гібелі дзікіх жывёл пад коламі аўтатранспартных сродкаў. Сёння на парадку дня стаіць абсталяванне пераходаў над трасамі на шляху прыродный міграцыі дзікіх жывёл, таму што ў падземныя пераходы тыя ніколі не пойдуць.

— Як бачыце, работа дзяржінспектараў шматвектарная. Часам мяне пытаюць, ці хапае на ўсё гэта сіл, бо, калі палічыць, то на кожнага інспектара прыпадае ў сярэднім 33 тысячы гектараў лесу, каля 40 азёр і 360 кіламетраў рэк, якія трэба кантраляваць. Але я перакананы, што вынік залежыць не столькі ад колькасці супрацоўнікаў, колькі ад якасці іх працы, — дадаў Сяргей Новікаў. — Акрамя таго, з намі цэлая армія добраахвотных памочнікаў. Штомесяц на тэлефон даверу Дзяржінспекцыі паступае каля 200 званкоў. Людзі не хочуць мірыцца з драпежніцкім стаўленнем да прыроды і садзейнічаюць дзяржінспектарам у затрыманні парушальнікаў.

У найбліжэйшы час Дзяржінспекцыя збіраецца запусціць мабільную праграму, якая дазволіць неабыякавым людзям тэрмінова паведамляць аб выяўленых парушэннях: браканьерстве, незаконнай лоўлі рыбы, высечцы лесу і гэтак далей. «Грамадзянін зможа зафіксаваць гэты факт і адправіць інфармацыю ці фота ў інфармацыйны цэнтр нашай дзяжурнай службы. Далей сігнал паступіць да спецыяліста, які знаходзіцца бліжэй за ўсіх да згаданага месца. Але рэакцыя на яго будзе адпавядаць сур'ёзнасці здзейсненага парушэння прыродаахоўнага заканадаўства, — папярэдзіў начальнік Дзяржінспекцыі. — Канешне, у першую чаргу інспектар будзе рэагаваць на грубыя парушэнні. Тэставы рэжым праграмы запрацуе ўжо ў найбліжэйшыя дні».

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

## Добрая традыцыя званкоў

**Прамыя тэлефонныя лініі пройдуць у суботу 27 студзеня ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах, на званкі грамадзян з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:**

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Мікалай Васілевіч ТОКАР. Тэл. 8-016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8-021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8-023 233 12 37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8-015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8-022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА абласавета дэпутатаў Іван Эдуардавіч ЛІПНІЦКІ. Тэл. 8-017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Пятровіч КРЭПАК. Тэл. 8-017 222 44 44.

■ Дзеля спакою

# СЛУЖБА ДНІ І НОЧЫ

**Кіраўнік міліцыі Віцебшчыны расказаў пра леташнія вынікі працы: за пяць гадоў колькасць злачынстваў паменшылася на 13,4 %. У тым ліку забойстваў: з 52 у 2013 годзе да 39 — у мінулым. Усяго ў 2017-м зарэгістравана каля 10,3 тысячы злачынстваў.**

### Найлепшы ўчастковы — у Наваполацку

**Начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама Іван КУБРАКОЎ,** распавядаючы пра ўчастковых, канстатаваў, што ў 2017-м найлепшым у краіне стаў Вадзім Марковіч з Наваполацкага ГАУС. А ў аглядзе-конкурсе прафесійнага майстэрства, які праводзіўся летась 13-ы раз, участковыя інспектары Віцебскай вобласці сем разоў былі пераможцамі!

— Па выніках ацэнкі службовай дзейнасці ўчастковых вобласць заняла другое месца, саступіўшы толькі Мінску. Асноўны прыярытэт у іх працы сёння — забеспячэнне дзейснай прафілактыкі правапарушэнняў, што прадугледжвае перш за ўсё работу з людзьмі, — сказаў палкоўнік міліцыі.

Дарэчы, кожнае пятае злачынства па лініі крымінальнага вышуку раскрылі летась участковыя. Яны ў ліку іншага накіравалі ў ЛПП 1005 хранічных алкаголікаў. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі каля 6,7 тысячы сямейных дэбашыраў. Канфіскавана з незаконнага абароту 1325 літраў фальсіфікаванай алкагольнай прадукцыі. А за яе распаўсюджванне складзена больш за 1,2 тысячы адміністрацыйных пратаколаў.

Аб злачыннасці ў сельскай мясцовасці: з амаль 3 тысяч — большасць складаюць крадзяжы, ухіленні ад выплаты аліментаў.

### Дзяўчыне прапанавалі пракаціцца...

Адзін з прыкладаў раскрыцця злачынстваў мінулых гадоў — па ўстанаўленні месцазнаходжання без вестак зніклай 17-гадовай.

У кастрычніку 2012 года ў Полацкі ГАУС з заявай звярнулася яе маці. Сказала, што каля трох гадзін ночы дачка пайшла з дому і не вярнулася.

Вызначылі, што ў раёне знікнення былі двое мясцовых жыхароў, якія каталіся на аўтамабілі з мэтай знаёмства... Пры гэтым тады даказаў іх дачынення да знікнення дзяўчыны знойдзена не было. Але летась вышук зніклай атрымаў «новы віток».

— У ходзе аператыўных мерапрыемстваў атрымалі інфармацыю аб смерці дзяўчыны і магчымым месцы яе пахавання ў лесе ў Полацкім раёне. Некалькі гектараў у літаральным сэнсе слова прамацалі міліцыянеры: сантыметр за сантыметрам. Труп зніклай пяць гадоў таму быў знойдзены, — пракаментаваў Іван Кубракоў.

Падчас расследавання высветлілася, што мужчыны ў начны час у цэнтры горада пазнаёміліся з 17-гадовай, якая ішла па вуліцы. Прапанавалі пракаціцца, а ў салоне аўто — выпіць, дадаўшы ў напой лекавы сродак са снатворным эфектам. Прывезлі дамоў да аднаго са зламыснікаў — у Наваполацк. У кватэры дзяўчына ад прынятага прэпарату памерла. Труп вывезлі і закапалі...

Было ўстаноўлена, што дзяўчыну хацелі згвалтаваць.

— Злачынствы мужчыны здзяйснялі па гэтай жа схеме некалькі гадоў. На жаль, ахвяры ў праваахоўныя органы не звярталіся. Перш за ўсё таму, што ад дзеяння лекавых прэпаратаў шмат забывалі, а калі і памяталі, то ім было сорамна.

Устаноўлена дачыненне да аналагічных злачынстваў яшчэ двух мужчын. Усе арыштаваныя і ўтрымліваюцца ў следчым ізалятары. Расследаваннем крымінальнай справы займаецца цэнтральны апарат Следчага камітэта і ўпраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь...

### З алмазнай плёнкай

Нягледзячы на пастаяннае павелічэнне колькасці аўто і інтэнсіўнасці дарожнага руху, колькасць ДТЗ значна знізілася. Калі ў 2013 годзе іх было зарэгістравана 500, то ў 2017-м — 375. Колькасць загінулых зменшылася на 45 %, параненых — на 19 %.

Па прапанове ДАІ УУС мінулай вясной распрацавалі праграму паэтапнай замены дарожных знакаў. За год на 60 пешаходных пераходах аўтадарог рэспубліканскага значэння на дарожныя знакі «Пешаходны пераход» нанесена алмазная плёнка жоўтага колеру. Гэта дазваляе павысіць святлоадбівальнасць у цёмны час. Летась усталявалі 550 такіх знакаў на 154 нерэгулюемых пешаходных пераходах.

Па сумеснай ініцыятыве ДАІ і мясцовай улады пачаты работы па замене лямпаў вулічнага асвятлення на святлодыёдныя... Гэта дазваляе сэканоміць спажыванне электрычнасці і палепшыць асветленасць. Адпаведна — станоўча ўплывае на бяспеку дарожнага руху ў цёмны час сутак.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЕС ВЫКЛЮЧЫЎ З ЧОРНАГА СПІСУ АФШОРАЎ ВОСЕМ КРАІН

Савет Еўрасаюза выключыў восем краін з чорнага спісу афшораў, перадае ТАСС. «Барбадас, Грэнада, Рэспубліка Карэя, Макаа, Мангolія, Панама, Туніс і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты перамешчаныя ў асобную катэгорыю юрысдыкцый, якія падлягаюць пільнаму маніторынгу», — гаворыцца ў паведамленні савета. Рашэнне прынята ў сувязі з экспертнай ацэнкай абавязацельстваў на вышэйшым палітычным узроўні, узятых гэтымі юрысдыкцыямі па ліквідацыі недахопаў, на якія ўказваў Еўрасаюз. У чорным спісе «падатковых гаваняў» ЕС застаецца яшчэ дзевяць краін і тэрыторый: Амерыканскае Самоа, Бахрэйн, Гуам, Маршалавы Астравы, Намібія, Палаў, Сент-Люсія, Самоа, Трынідад і Табага.

### НІКАЛАС МАДУРА АНАНСАВАЎ ПАЧАТАК ПЕРАГАВОРАЎ З АПАЗІЦЫЯЙ



Прэзідэнт Венесуэлы Нікалас Мадура заявіў, што перагаворы ўлад і апазіцыі могуць аднавіцца ў канцы студзеня. «Мы гаворым аб працягу дыялогу для падпісання пагаднення аб міры 28 і 29 студзеня. Калі так і будзе, венесуэльская дэлегацыя, якую ўзначальвае міністр сувязі і інфармацыі Хорхе Радрыгес, прыбудзе першай», — прыводзіць партал Sumarium заяву Мадура. Як вядома, перагаворы ўлад і апазіцыі ідуць з верасня 2017 года ў Дамініканскай Рэспубліцы. Пасля некалькіх раўндаў дыялог быў прыпынены.

### НА СІЦЫЛІІ АРЫШТАВАЛІ 40 МАФІЁЗІ КЛАНА, ЗВЯЗАНАГА З «КОЗА НОСТРА»

Італьянскія паліцэйскія і карабінеры арыштавалі 40 удзельнікаў аднаго з кланаў, звязаных з «Коза ностра», паведамілі следчыя. Мафіёзная група, вядомая як «Барселонская сям'я», дзейнічала ў раёне горада Месіна ва ўсходняй часцы вострава. Усе арыштаваныя абвінавачваюцца ў традыцыйных для італьянскай мафіі правапарушэннях: вымагальніцтва, махлярства, крадзяжы, незаконнае захоўванне зброі, пагрозы і гвалт. Дарэчы, гэта ўжо трэцяя буйная аперацыя па барацьбе з мафіяй з пачатку гэтага тыдня.

### СЕНА ВЫЙШЛА З БЕРАГОЎ



З-за паводкі ў Парыжы і яшчэ 23 дэпартаментах Францыі ўведзены аранжавы ўзровень трывогі. Пад'ём узроўню вады выклікаў перабоі ў руху транспарту. Мэр французскай сталіцы Ан Ідальга стварыла крызісны штаб, у які ўвайшлі кіраўнікі ўсіх падраздзяленняў гарадскога транспарту і камунальных службаў. Кіраўніцтва двух найбуйнейшых музеяў — Луўра і Арсэ — уважліва сочаць за сітуацыяй і рыхтуецца эвакуіраваць творы мастацтва з запаснікаў, як толькі ўзровень Сены перавысіць крытычны. Начальнік паліцыі Парыжа Мішэль Дэльпу параіў жыхарам «асцерагацца падыходзіць да вады», а тым, хто жыве на баржах Сены, — перамясціцца на сушу. Максімальнага пад'ёму ўзроўню вады (да 6,1 метра) чакаюць у пятніцу 26 студзеня, апошні раз такі ўзровень вады быў зафіксаваны ў 2016 годзе.

# ВЫХОДЗІМ НА ФІНІШНУЮ ПРАМУЮ

## Першыя беларусы адправяцца ў Пхёнчхан ужо 27 студзеня, спартсмены прыбудуць у Паўднёвую Карэю 1 лютага

**22 студзеня скончыўся розыгрыш алімпійскіх ліцэнзій ва ўсіх відах спорту, якія будуць прадстаўлены на XXIII зімовых Алімпійскіх гульнях. У Пхёнчхане ад Беларусі выступяць 28 спартсменаў (на Гульнях у Сочы 4 гады таму іх было 27) у шасці відах спорту.**

**Намеснік міністра спорту і турызму, шэф беларускай місіі на Гульнях-2018 Аляксандр БАРАВУЛЯ** адзначыў, што ўсе беларускія алімпійцы зараз праходзяць завяршальны этап падрыхтоўкі, большасць з іх займаюцца гэтым у Беларусі за выключэннем біятланістаў і фрыстайлістаў. Страляючыя лыжнікі пройдуць завяршальны этап у Германіі, а лыжныя акрабаты ў бліжэйшы час адправяцца ў Японію. *«Увесь комплекс запланаваных трэніровачных мерапрыемстваў выкананы ў поўным аб'ёме»,* — падкрэсліў Аляксандр Іванавіч.

Да Сеула нашы спартсмены дабяруцца на самалёце, адтуль 300 км да Пхёнчхана пераадолеюць наземным транспартам. Гэтым разам на Гульнях будзе адразу дзве алімпійскія вёскі: прыбярэжная размяшчаецца ў мястэчку Канын, там будуць жыць спартсмены, якія прадстаўляюць лядовыя дысцыпліны (шорт-трэк і канькабежны спорт), усе астатнія (прадстаўнікі лыжных дысцыплін) размесцяцца ў самім Пхёнчхане. Хто стане суседзямі беларускай дэлегацыі ў алімпійскай вёсцы, пакуль невядома. Таксама на стадыі абмеркавання пытанне аб тым, хто панясе беларускі сцяг на цырымоніі адкрыцця Алімпіяды.

*— Спартыўныя аб'екты знаходзяцца недалёка ад вёсак, напрыклад стадыён, дзе будуць праходзіць спаборніцтвы па лыжных гонках і біятлоне, размяшчаецца ў 10 хвілінах ад алімпійскай вёскі,* — расказаў **намеснік шэфа місіі, начальнік аддзела міжнародных адносін НАК Васіль ЮРЧЫК.** — *Арганізатары Алімпіяды-2018 далажылі, што вёска гатовая прыняць спартсменаў, з транспартнымі зносінамі таксама не існуе праблем. Адлегласць паміж дзвюма вёскамі 50 км, паміж імі, відома ж, таксама будуць наладжаны транспартныя зносіны.*

Алімпійская вёска ў Пхёнчхане ўяўляе сабой новыя мікраараёны са шматпавярховымі дамамі, пабудаванымі спецыяльна для Гульняў. Згодна з патрабаваннямі Міжнароднага алімпійскага камітэта, дэлегацыі будуць забяспечаны ўсімі відамі кухні, у тым ліку еўрапейскай. У студзені-лютым тэмпература паветра ў Карэі мала адрозніваецца ад беларускай, напрыклад на стане на 23 студзеня ў Пхёнчхане было ад мінус 10 да мінус 15 градусаў.

Прапрацаваны ўсе пытанні медыцынскага забеспячэння беларускіх алімпійцаў, **дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра спорту, кіраўнік медыцынскай групы Генадзь ЗАГАРОДНЫ** расказаў пра тое, што спецыялістамі былі падняты дакументы мінулых Алімпіяд, якія праходзілі ў гэтым рэгіёне, на Далёкім Усходзе, атрымалася нават знайсці матэрыялы з Сеула-88. Такая работа праведзена для таго, каб падрыхтаваць для беларускіх спартсменаў адпаведныя рэкамендацыі.

*— Сфарміраваны і падрыхтаваны медыцынскі груз — лекавыя прэпараты і фізіка-тэрапеўтычнае абсталяванне. Акцэнт мы робім на моманты, звязаныя з доўгім пералётам і зменай гадзінных паясоў,* — адзначыў Генадзь Міхайлавіч. — *Што датычыцца магчымых рызык, то яны, вядома, ёсць, гэта ў першую чаргу рэспіраторныя захворванні.*

**Міністр спорту і турызму краіны Аляксандр ШАМКО** падкрэсліў, што сёння ніхто не ставіць перад нашымі спартсменамі ніякіх медальных планаў. *«Не таму, што мы не хочам заваяваць узнагароды, а таму што не хочам ставіць псіхалагічныя бар'еры і перашкоды нашым атлетам. Міністэрства, Нацыянальны алімпійскі камітэт і федэрацыі па відах спорту зрабілі ўсё неабходнае для беларускіх алімпійцаў»,* — адзначыў міністр.



Фота БЕЛТА.

**Прэзідэнт Беларусі, прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне членам беларускай дэлегацыі на XXIII зімовых Алімпійскіх гульнях 2018 года ў горадзе Пхёнчхан.**

**«У нялёгкай барацьбе вы заваявалі ганаровае права прадстаўляць Беларусь на галоўным старце чатырохгоддзя — XXIII зімовых Алімпійскіх гульнях 2018 года ў горадзе Пхёнчхан. Уся краіна з заміраннем сэрца будзе сачыць за вашымі выступленнямі, радавацца поспехам і суперажываць», — гаворыцца ў прывітанні.**

**«Перакананы, што ў Паўднёвай Карэі вы зробіце ўсё магчымае для перамогі. Ва ўмовах абвостранай да мяжы канкурэнцыі гэта няпростая задача. Тым больш каштоўнымі будуць вашы алімпійскія дасягненні, якія стануць найлепшым укладам у выхаванне моцнай, здаровай нацыі, умацаванне аўтарытэту Беларусі на міжнароднай арэне і прыкладам для падрастаючага пакалення», — адзначыў беларускі лідар.**

**Аляксандр Лукашэнка пажадаў членам беларускай дэлегацыі поспеху, моцнага здароўя і перамог у імя славы Радзімы.**

**У біятлоне** нашу алімпійскую каманду прадставяць Дар'я Домрачава, Надзея Скардзіна, Ірына Крыўко, Надзея Пісарава, Дзінара Алімбекава, Уладзімір Чапелін, Сяргей Бачарнікаў, Максім Верабей, Раман Ялётнаў, Антон Смольскі.

**Ад фрыстайлістаў** у Пхёнчхан адправяцца шэсць спартсменаў: Антон Кушнір, Станіслаў Гладчанка, Максім Гусцік, Ала Цупер, Ганна Гуськова і Аляксандра Раманоўская.

*— Наша падрыхтоўка ідзе ў рабочым працэсе, шмат што будзе залежаць ад завяршальнай стадыі ў Японіі,* — расказаў **галоўны трэнер каманды Мікалай КАЗЕКА.** — *Ала Цупер і Антон Кушнір будуць выступаць з той жа праграмай, што і на Гульнях у Сочы, Антон ужо ў добрай форме, але мяркуем, што ён можа дадаць яшчэ больш. Сёння мы не саступаем канкурэнтам ні ў складанасці, ні ў якасці скачкоў. Вельмі моцна падцягнуліся расіяне, сярод лідараў, як заўсёды, кітайцы, амерыканцы, у дзяўчат з'явіліся яшчэ моцныя аўстралійкі.*

**У лыжных гонках** на сваю сёмую Алімпіяду паедзе Сяргей Далідовіч, а таксама Аляксандр Воранаў, Юрый Астапенка, Міхаіл Сямёнаў, Юлія Ціханава, Паліна Сераносава і Анастасія Кірылава.

**У гарналыжным спорце** Беларусь прадставяць Марыя Шканава і Юрый Данілачкін. **У шорт-трэку** — Максім Сяргееў. **У канькабежным спорце** выйдуць на лядовы авал Марына Зуева і Ігнат Галавацюк.

*— Апошні этап Кубка свету з'яўляўся перадалімпійскім тэстам для нас. І Марына, і Ігнат выступілі выдатна, хоць напярэдадні былі сур'ёзныя складанасці, стрэсы — праводзілі падрыхтоўку ў няпростых умовах: гэта горы, холад, вельмі цяжкія трэніроўкі,* — расказаў **галоўны трэнер па канькабежным спорце Сяргей МІНІН.** — *Аддача на трэніроўках велізарная, прыкметна як Гульні матывуюць спартсменаў, мяне гэта вельмі радуе. У Ігната гэта ўсяго першы сезон у дарослым спорце, і тут ён выступае цалкам нядрэнна. Задача мінімум — перасягнуць вынікі, якія спартсмены паказалі ў мінулым годзе.*

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

■ Футбол

# Будзем змагацца за першае месца

## Сталі вядомыя сапернікі зборнай Беларусі ў Лізе нацый

**Жараб'ёўка прайшла ў швейцарскай Лазане. Наша каманда ў групе II лігі D згуляе з футбалістамі Сан-Марына, Малдовы і Люксембурга.**

*— Я думаю, што гэта нармальная жараб'ёўка для нас. Сапернікі з другой-трэцяй карзін аднолькавыя,* — каментуе **галоўны трэнер зборнай Беларусі Ігар КРЫВУШЭНКА.** — Трапіў наш «родны» Люксембург, гэта магчымасць узяць рэванш. Ну і будзем змагацца за першае месца ў групе. Гэты турнір — добрае пачынанне, больш гульняў, у якіх трэба гуляць на вынік, усе яны маюць значэнне. Чым часцей зборная збіраецца і гуляе — тым лепшае ўзаемадзеянне. Натуральна, павінен быць лепшы вынік.

Адзначым, што адным з удзельнікаў жараб'ёўкі быў вядомы беларускі футбаліст Аляксандр Глеб. Пры яго непасрэдным удзеле свае месцы ў трох іншых квартэтах атрымалі і астатнія каманды слабейшага дывізіёна Лігі нацый УЕФА:

I — Андора, Казахстан, Латвія, Грузія.

III — Косава, Мальта, Азербайджан, Фарэрскія астравы.

IV — Македонія, Арменія, Гібралтар, Ліхтэнштэйн.

Групавы этап стартуе 6 верасня 2018-га, а фінішуе ў лістападзе 2019 года. Пераможцы чатырох квартэтаў сустрэнуцца адзін з адным у матчах плэй-оф і разыграюць пуцёўку на чэмпіянат Еўропы — 2020.

Усяго ў першым розыгрышы Лігі нацый прымуць удзел 55 зборных, якія прадстаўляюць усе краіны, якія ўваходзяць ва УЕФА.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ** ■

■ Клопат

# ДАПАМОГА — ПА АДРАСЕ

**Калі сям'я з'яўляецца малазабяспечанай або чалавек з аб'ектыўных прычын апынуўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі (з прычыны поўнай непрацаздольнасці з-за інваліднасці ці дасягнення 80-гадовага ўзросту, а таксама нездольнасці да самаабслугоўвання ў сувязі з хваробай; з-за стыхійных бедстваў, катастроф, пажару і інш.), яны маюць права звярнуцца па Дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу (ДАСД). Прычым такое права маюць як грамадзяне Беларусі, так і замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у нашай краіне.**

Адрасную дапамогу (ДАСД) у Беларусі можна атрымаць у выглядзе:

✓ штомесячнай і (або) аднаразовай сацыяльных дапамог (выдаецца на набыццё прадуктаў харчавання, лекаў, адзення, абутку, школьных прылад і на іншыя патрэбы для забеспячэння нармальнай жыццядзейнасці, а таксама на аплату (цалкам або часткова) жыллёва-камунальных паслуг);

✓ сацыяльнай дапамогі для пакрыцця выдаткаў на набыццё падгузкаў;

✓ забеспячэння прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця.

Акрамя заявы і пашпарта, для кожнага віду дапамогі трэба падаць свой пакет дакументаў. Рашэнне аб выдзяленні (аб адмове ў выдзяленні) адраснай дапамогі, яе форме і перыядзе атрымання прымаецца спецыяльнай камісіяй. Пры гэтым для працаздольных грамадзян камісія можа распрацаваць план па самастойным паляпшэнні матэрыяльнага становішча. У далейшым пры паўторным звароце па дапамогу яе выплата такім грамадзянам будзе залежаць ад выканання гэтага плана.

У 2017 годзе дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу атрымалі 310,2 тыс. чалавек.

**Святлана БУСЬКО.**




■ Здарэнні

## Зноў упаў мотадэльтаплан

**На шчасце, гэтым разам абышлося без ахвяр. Пілот і пасажыр лятальнага апарата, якія былі ў ім на момант падзення, не пацярпелі.**

— Здарэнне адбылося ўдзень у полі паблізу вёскі Азярцо Мінскага раёна, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Настасся ШВАЙБОВІЧ.** — Мотадэльтаплан здзейсніў аварыйную пасадку на аддаленні каля 400 метраў ад дарогі. Ніхто не пацярпеў, дапамога МНС не спатрэбілася. У выніку падзення лятальны апарат атрымаў механічныя пашкоджанні. Абставіны і прычына падзення ўстанаўліваюцца.

Нагадаем, што 11 студзеня ва Ушацкім раёне таксама ўпаў мотадэльтаплан. Тады пілот лятальнага апарата загінуў.

## «Сустрэліся» два «бяспраўнікі»

**Яны — адзін на трактары, другі — на легкавіку — сутыкнуліся пад Мінскам.**

Аварыя адбылася ўдзень на вуліцы Энтузіястаў у пасёлку Калодзішчы-2. Нецвярозы кіроўца за рулём легкавога «Крайслера» для абгону выехаў на раздзяляльную паласу, дзе сутыкнуўся з трактарам МТЗ. Апошні ехаў паперадзе. Па інфармацыі УДАІ Мінскага раёна, абодва ўдзельнікі дарожна-транспартнага здарэння раней былі пазбаўлены вадзіцельскіх правоў за язду нападпітку. Дарэчы, у крыві кіроўцы легкавіка і зараз на момант медыцынскага агляду было выяўлена 0,39 праміле алкаголю. Мужчына падчас аварыі атрымаў цялесныя пашкоджанні, але не шпіталізаваўся.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

■ На здароўе

# БЕЛАРУСАЎ БУДУЦЬ ЛЯЧЫЦЬ ПА-КІТАЙСКУ

## На базе Мінскай абласной клінічнай бальніцы ў Бараўлянах адкрыўся цэнтр традыцыйнай кітайскай медыцыны

**— Наша дэлегацыя ў лістападзе мінулага года наведала Кітай, — расказаў галоўны ўрач установы аховы здароўя Андрэй КАРОЛЬКА. — Мы змаглі на ўласныя вочы ўпэўніцца ў эфектыўнасці метадаў, якія выкарыстоўваюць кітайскія ўрачы. І ў межах пагаднення паміж нашымі краінамі адкрылі такі цэнтр.**

Для пацыентаў, якія знаходзяцца на стацыянарным лячэнні, пры абследаванні і наяўнасці паказанняў дапамога будзе аказвацца на бюджэтнай аснове. Амбулаторныя наведнікі таксама могуць запісацца на прыём і пасля стандартнага абследавання атрымаць платнае лячэнне. На працягу двух тыдняў кітайскія спецыялісты праведуць майстар-класы для беларускіх калег, у тым ліку і для тых, якія прайшлі адпаведныя курсы ў Кітаі. Кіраўніцтва бальніцы плануе таксама накіраваць сваіх урачоў у цэнтры традыцыйнай кітайскай медыцыны правінцыі Чжэцзян для атрымання неабходнай кваліфікацыі.

Цэнтр створаны на базе аддзялення медыцынскай рэабілітацыі. У ім пяць асобных памяшканняў з працэдурнымі кабінетамі. Закуплена таксама сучаснае абсталяванне, зроблены рамонт, падрыхтаваны персанал. Штодзень тут плануецца прымаць да 50 чалавек. Распрацаваны ліст чакання, і ўсе ахвотныя змогуць у кароткі тэрмін прайсці абследаванне і лячэнне.

Асноўныя метады аздараўлення — праграванне, традыцыйны кітайскі масаж, іголкаўколванне (акупунктура). Акрамя таго, у Беларусі паспяхова прымяняецца і лазерапунктура з дапамогай прыбораў айчыннай вытворчасці.

Як адзначыў Андрэй餐餐Каролька, цяжэй сказаць, дзе традыцыйную кітайскую медыцыну прымяняць нельга. У ліку супрацьпаказанняў цяжкія інфекцыйныя, анкалагічныя захворванні. А наогул кітайскія метады добра дапамагаюць пры хваробах пазваночніка, суставаў, сасудзістай, рэўматалагічнай паталогіях.

— Традыцыйная кітайская медыцына не з'яўляецца чымсьці новым для жыхароў нашай краіны, — канстатаваў **галоўны пазаштатны спецыяліст па нетрадыцыйных метадах лячэння Міністэрства аховы здароўя Беларусі, прафесар, акадэмік Аляксандр СІВАКОЎ.** — На кафедры рэфлексатэрапіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі на працягу трыццаці гадоў падрыхтавана дастатковая колькасць спецыялістаў, якія працуюць у розных клініках краіны. Апошнім часам адносіны з КНР у галіне традыцыйнай кітайскай медыцыны развіваюцца даволі плённа. Штогод урад гэтай дзяржавы прадастаўляе магчымасць для стажыроўкі нашых урачоў. На працягу гэтага года такія цэнтры з'явяцца ва ўсіх абласных цэнтрах.



Фота БЕЛТА.

Прадстаўнік Упраўлення кітайскай народнай медыцыны правінцыі Чжэцзян і галоўны ўрач Мінскай абласной клінічнай бальніцы Андрэй Каролька.

Па словах Аляксандра Сівакова, метады кітайскай традыцыйнай медыцыны эфектыўныя пры лячэнні самых розных захворванняў: перыферычнай нервовай сістэмы, унутраных органаў, органаў дыхання, страўнікава-кішачнага тракту і іншых, і даказалі сваю эфектыўнасць. З іншага боку, у шэрагу выпадкаў гэтыя метады павышаюць рэзультатыўнасць тых, што ўжо прымяняюцца.

Прадстаўнік упраўлення кітайскай народнай медыцыны правінцыі Чжэцзян выказаў спадзяванне на далейшае супрацоўніцтва з беларускімі калегамі, што дасць магчымасць большасці беларусаў пазнаёміцца з традыцыйнай кітайскай медыцынай.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# АБСЛЕДАВАННІ — НА НОВЫМ УЗРОЎНІ

**У Брэсцкай абласной бальніцы з'явіўся новы камп'ютарны тамограф.**

Новы апарат стаў трэцім камп'ютарным тамографам у гісторыі абласной бальніцы. Першы быў устаноўлены яшчэ ў 1995 годзе, праз 12 гадоў яго змяніў другі апарат. Але ж такое абсталяванне мае ўласцівасць адносна хутка маральна і фізічна старэць. Таму новы КТ японскай фірмы «TOSHIBA» быў вельмі патрэбны абласной клініцы, у якой праходзяць абследаванне і лячэнне пацыенты з усёй вобласці.

Паводле інфармацыі **намесніка галоўнага ўрача бальніцы Вікторыі ХВАЛЬ**, на папярэднім абсталяванні штогод выконвалі ад 14 да 15 тысяч сканаванняў. Трэць з іх — складаныя сканаванні ўнутраных органаў галавы, сасудаў. Магчымасці ж новага апарата ў разы пераўзыходзяць папярэдніка. Мяркуецца, што аддзяленне КТ будзе працаваць у кругласутачным рэжыме.

Перад устаноўкай новага тамографа былі праведзены рэканструкцыя і рамонт памяшканняў. Для хворых, якія на абследаванне дастаўляюць машыны хуткай дапамогі, прадугледжаны асобны ўваход з вуліцы. Мантаж абсталявання правялі спецыялісты швейцарскай фірмы з прадстаўніцтвам у Беларусі. Для навучання персаналу асаблівасцям работы на КТ запрошаны спецыяліст з Масквы.

Рэспубліканскаму бюджэту новае абсталяванне абышлося ў 1 мільён 900 тысяч рублёў. Амаль 622 тысячы рублёў каштавалі рамонт і рэканструкцыя памяшкання.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ З нагоды

# Тут рыхтуюць сапраўдных мужчын

**У Магілёве далі старт рэспубліканскаму месячніку абаронна-патрыятычнай і спартыўнай работы ў гонар 100-гадовага юбілею Узброеных Сіл Беларусі.**

У аўторак на пляцоўцы каля Магілёўскага абласнога кадэцкага вучылішча было асабліва шматлюдна. Перад уваходам у будынак і ў фае ўстановы дэманстраваліся апошнія дасягненні тэхнічнага майстэрства выхаванцаў і настаўнікаў магілёўскага савета ДТСААФ. Магілёў стаў стартавай пляцоўкай месячніка, падчас якога ва ўсіх абласцях і раёнах краіны адбудуцца аўтапрабегі па месцінах баявой славы, тэматычныя вечары і ўрокі мужнасці, сустрэчы з ветэранамі і воінамі-інтэрнацыяналістамі. Дарэчы, 22 студзеня Магілёўскай абласной арганізацыйнай структуры ДТСААФ споўнілася 80 гадоў.

— Летась мы падрыхтавалі больш за 5 тысяч спецыялістаў для народнай гаспадаркі краіны, у тым ліку — 460 для Ўброеных Сіл, — адзначыў яе старшыня Аляксандр Мазур. — Юнакі маюць магчымасць атрымаць у нас спецыяльнасці кіроўцы, у тым ліку кіроўцы-электрыка, і іншыя.

У вобласці функцыянуе больш за 200 пярвічак ДТСААФ, якія аб'ядноўваюць 13 670 чалавек. Працуе 76 секцый па спорце, дзе займаецца больш за 3 тысячы дзяцей і падлеткаў. Матабол, джып-трыял, пейнтбол, лазертаг, страйкбол, картынг, матакрос, радыётэлеграфія — у юнакоў ёсць рэальная магчымасць выпрабаваць сябе ў самых сучасных відах спорту, а заадно сур'ёзна падрыхтавацца да службы ў арміі.

У рамках адкрыцця месячніка адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння членскіх білетаў і значкоў новым членам абароннага Таварыства, а юныя выхаванцы абласнога кадэцкага вучылішча атрымалі пагоны. Шэрагу прадстаўнікоў дзяржустаноў і царквы былі ўручаны юбілейныя медалі. У гэты ж дзень каля помніка герою абароны Магілёва палкоўніку Сямёну Куцепаву адбыўся ўрачысты мітынг і былі ўскладзены кветкі. Удзел у мерапрыемствах прыняў старшыня цэнтральнага савета ДТСААФ Іван Дырман.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

# НЯЛАСКАВЫ ЗВЕР

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— У многіх з нас уяўленне пра шаленства абмежавана «страшылкамі» пра 40 уколаў у жывот пасля ўкусу бяздомнага сабакі...***

— Шаленства — гэта вострае інфекцыйнае захворванне, якое выклікаецца спецыфічным вірусам. Яно паражае цэнтральную нервовую сістэму. Захворванне вядома са старажытных часоў, яго апісанне ёсць нават у папірусах. У тыя часы, дарэчы, яго імкнуліся выпальваць гарачым жалезам, аднак усе хворыя паміралі. Толькі ў 1885 годзе была створана вакцына супраць гэтай хваробы. Спецыфічнай тэрапіі гэтага захворвання няма — яго нельга вылечыць. Калі шаленства развілося, гэта ў 100 працэнтах выпадкаў смяротна. Праўда, у медыцынскай літаратуры апісана тры выпадкі ў свеце, калі пацыентау ўдалося вярнуць да жыцця. У прыватнасці, у 2005 годзе амерыканку для гэтага ўвялі ў штучную кому. А вось папярэдзіць шаленства можна. Штогод ад шаленства ў свеце гіне да 55 тысяч чалавек. Каля чатырох мільёнаў праходзяць курс прафілактычных прышчэпак.

***— Выпадкі захворвання на шаленства чалавека ў Беларусі здараюцца?***

— Так. Апошні з іх з лятальным канцом зарэгістраваны ў 2011 годзе. А кантакты людзей з хворымі на шаленства жывёламі рэгіструюцца штогод.

***— Як адбываецца заражэнне?***

— Гэта хвароба цеплакроўных жывёл і чалавека. Лісіцы, што і птушка можа захварэць — калі штучна ў яе мозг уводзілі вірус, развівалася шаленства. Пік зваротаў грамадзян, пацярпелых ад укусаў жывёл, прыходзіцца на асенне-летні перыяд, калі людзі актыўна выязджаюць за горад. Заражэнне часцей за ўсё адбываецца ад сабак, нашмат радзей — ад кошак. Інфіцыраванне адбываецца цераз скуру ці слізістыя абалонкі, калі жывёла ўкусіла, аблізала, падрапала чалавека. Можна заразіцца падчас разбірання тушы дзікай жывёлы. Хатнія жывёлы, у прыватнасці сабакі, часцей за ўсё заражаюцца ад вожыкаў, лісіц, ваўкоў, янотаў.

***— Хвароба непераможная, бо яе пераносчыкі — дзікія жывёлы?***

— Так. Да апошняга часу вірус шаленства рэгіструецца на ўсіх кантынентах, акрамя Аўстраліі. Цяпер кажаны сталі пераносчыкамі захворвання, і гэты кантынент перастаў быць выключэннем. Хворая жывёла абавязкова памірае. У маёй медыцынскай практыкі мне давялося назіраць хворага на шаленства чалавека, прычым на разгорнутай стадыі хваробы. У пацыента з'яўлецца вада- і святлабоязь. Адчыненае акно з павевам ветру, гук вады ў ракавіне — усё гэта выклікае моцны спазм мышцаў. На заключнай стадыі хворага разбівае параліч, ад чаго ён і гіне.

**«Чым бліжэй зона ўкусу знаходзіцца да галавы, тым меншы інкубацыйны перыяд і вышэйшая рызыка інфіцыравання».**

***— Як пазбегнуць захворвання, калі, скажам, цябе ўкусіў сабака?***

— Вірус шаленства знаходзіцца ў ране каля сутак. І каб пазбегнуць захворвання, трэба ўмець правільна аказаць першую дапамогу. Пры ўкусах любых жывёл, нават прышчэпленых, трэба прамыць рану ці драпіну, куды трапіла сліна, з мылам пад праточнай вадой не менш за 15 хвілін. Вірус шаленства інактывуецца мылам, асабліва гаспадарчым, дзе ўтрымліваецца вялікі працэнт шчолачы. Таму важна пастарацца яго знішчыць такім чынам. Краі раны трэба апрацаваць спіртаўтрымліваючым растворам, накласці павязку і неадкладна звярнуцца па медыцынскую дапамогу. Менавіта хуткасць звароту мае вялікае значэнне. Пацярпеламу праводзіцца вакцынацыя, якая складаецца з курса антырабічных прышчэпак. Вакцына індуцыруе выпрацоўку імунітэту супраць віруса шаленства. Прышчэпкі робяцца ў дэльтавідную мышцу пляча ў дзень укусу, а таксама на 3-і, 7-ы, 14-ы, 30-ы і 90-ы дні пасля першай ін'екцыі. Часам вакцынацыю дапаўняюць увядзеннем імунаглабуліну. Яны ўтрымліваюць антыцелы, якія блакуюць вірус, што знаходзіцца ў ране, перакрываюць яму шлях да цэнтральнай нервовай сістэмы. Укусы дзеляцца па катэгорыях небяспекі: у твар і шыю маюць самую высокую рызыку развіцця шаленства. Укусы за рукі, стопы, геніталіі таксама вельмі небяспечныя. Чым бліжэй зона ўкусу знаходзіцца да галавы, тым меншы інкубацыйны перыяд і вышэйшая рызыка інфіцыравання.

***— Які ўвогуле інкубацыйны перыяд у віруса шаленства?***

— У сярэднім ад двух тыдняў да двух месяцаў. Але можа быць значна даўжэйшы — да 12 месяцаў. Таму ў любы тэрмін, калі вас пакусала жывёла, неабходна праходзіць курс прышчэпак. Пацыент павінен звяртацца па месцы жыхарства або да траўматолага, або ў антырабічны кабінеты. За жывёлай таксама трэба назіраць.

***— Якія правілы трэба выконваць, каб засцерагчыся ад шаленства?***

— Хатнія кошкі і сабакі абавязкова павінны быць прышчэплены супраць шаленства. Калі жывёла вас укусіла ці падрапала, не трэба яе забіваць. За ёй варта назіраць 10 дзён — за гэты час хворая на шаленства жывёла памірае. Калі жывёла дзікая, ліса ці воўк, і яна ідзе да людзей — на падвор'е, у вёску, то, як правіла, яна хворая на шаленства. У іх звычайна неадэкватныя паводзіны, назіраецца цячэнне сліны. З такімі жывёламі варта пазбягаць кантакту і інфармаваць ветэрынарныя службы. Калі знайшлі мёртвую жывёлу, не чапайце яе ні ў якім разе, не знімайце шкуру. Таксама паведаміце пра яе ў ветэрынарныя службы. Нельга чапаць бадзяжных сабак, карміць іх, гладзіць, бо жывёла можа ўкусіць. Калі ўкусіла дзікая жывёла — янот, ліса, пацук, воўк — прышчэпкі робяцца абавязкова. Трэба памятаць, што поспех у барацьбе з шаленствам залежыць ад своечасова праведзенай вакцынацыі.

**Алена КРАВЕЦ.**

Сямейная газета
Выпуск № 2 (93)



## СЛЁЗЫ ЧАРАПАХІ

Летась мая знаёмая набыла для сваёй пяцігадовай дачкі дзвюх чарапашак. Жанчына, якая прадавала іх ля метро, сказала, што гэта нейкі там дэкаратыўны від, непатрабавальны, практычна не расце і нічога, акрамя маленькага акварыума і аднаго чарвяка ў дзень, ім не трэба. «Насця была ў такім захапленні ад малютак, што мы ўзялі іх не доўга думаючы. У той жа вечар я зразумела, што мяне проста нахабна падманулі... Жахліва, што людзі вось так адкрыта хлусяць, каб толькі пабольш прадаць. Я думаю, што большая частка чарапашак у выніку будзе загубленая праз няправільныя ўмовы догляду. Яшчэ частку гаспадары выкінуць у суседнюю сажалку, калі зразумеюць, што малыя растуць вельмі хутка і ім патрэбны ёмісты акварыум. А таксама фільтр, абагравальнік, лямпы (звычайная і ўльтрафіялетавая) і шмат ежы... Гэта час і грошы. ...Увогуле, прадаюць жывое, як бульбу. Брыдка».

Тое ж самае і з гумавымі цацкамі, якія бясплатна раздаюць у некаторых крамах. Асноўная іх мэта — завабіць як мага больш пакупнікоў. Маркетолагі зрабілі хітры ход: пачалі маніпуляваць дарослымі праз дзяцей. Не па чутках ведаю, што сур'ёзныя мамы ў сацыяльных сетках ствараюць суполкі і абменьваюцца цацкамі-паўтарашкамі.

Некалькі месяцаў таму бачыла ў гіпермаркеце, як дзяўчынка білася ў істэрыцы. Я спачатку падумала, што здарылася нешта страшнае, але малеча аж захадзілася ад слёз з-за... цацкі. Дакладней, з-за яе адсутнасці. Аказалася, у краме скончыліся гумавыя пачваркі...

Той дзень, калі мне ўпершыню разам з рэштай далі маленькую цацку, я буду памятаць доўга. Прыйшоўшы дадому, не прыдумала нічога лепшага, як даць яе свайму коціку. У той жа вечар зусім выпадкова прачытала, што такія цацкі «збіраюць»... ветэрынары. Аказваецца, некалькі катоў ужо праглынулі тую гумавую «радасць». У выніку трапілі пад нож. Бо дастаць пачварку, якая выклікае закупорку кішэчніка, можна толькі шляхам аперацыі. Памятаю, як я панічна бегала па кватэры і шукала тую чырвоную цацку. На шчасце, мой Цудзік яшчэ не паспеў яе з'есці.

Выпускаючы гумавых пачварак, ніхто не думае, што яны прывіваюць малым не самы добры густ. Маўчу ўжо пра шкоду для планеты. Гума, як і пластык, раскладаецца больш як 100 гадоў! Прыйдзе час, і дзецям надакучаць гэтыя цацкі. І што тады? Прывітанне, звалка з некалькіх дзясяткаў мільёнаў гумавых пачварак?

Нядаўна ў «Фэйсбуку» на старонцы Вольгі Астаповіч, прыхільніцы экалагічнага ладу жыцця, з'явіўся пост пад назвай «Чаму я больш не буду набываць сваё любімае малако». Аказалася, дзяўчына ўбачыла, што цяпер у камплекце з ім ідзе пластыкавая трубачка. «Так, я разумею, што такое рашэнне можа быць зручнейшае для якой-небудзь з мам, якая спрабуе напаіць сваё дзіця падчас прагулкі або прыцягнуць увагу да прадукту, «які скача» яму ў рот праз празрысты тунэль. Але, думаю, прасунутыя бацькі і ўсе-ўсе-ўсе разумеюць, што гэта зручнасць — толькі навязаны маркетынгавы ход. Насамрэч, выкарыстанне трубачак сёння можна апраўдаць толькі ў выпадку людзей з медыцынскімі патрэбамі». І прывяла некалькі аргументаў. Па-першае, кожная новая штучка на ўпакоўцы робіць прадукт даражэйшым. І нават калі кошт не памяняўся, то памянялася нешта іншае — якасць або колькасць. Па-другое, з-за трубачак вакол вуснаў з'яўляюцца маршчынкі. Па-трэцяе, трубачкі становяцца прычынай забруджвання зямлі і вады: яны не могуць быць перапрацаваныя і паступова ператвараюцца ў мікрапластык. І, нарэшце, памеры гэтага смецця настолькі малыя, што яно трапляе ўнутр марскіх жывёл. Паглядзіце на «Ютубе» відэа пра чарапаху, з ноздры якой дастаюць кактэйльную трубачку... Не можа не ўзрушыць.

Калі шчыра, я не змагла цалкам паглядзець той ролік. Адной слязінкі марской чарапахі хапіла, каб мне таксама не захацелася набываць тое малако.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

■ Вуснамі дзіцяці

**Вера ШПАКОЎСКАЯ:**

# «МАРУ СТАЦЬ СЛАВУТАЙ БАЛЕРЫНАЙ»

### Юная танцоўшчыца — пра чатырохгадзінныя трэніроўкі, любімыя ролі ды квіток у бізнес-клас



На конкурсе талентаў «Сіняя птушка».

**Балерыне Веры ШПАКОЎСКАЙ дзевяць гадоў. Яна любіць есці белы шакалад, заплятаць «гульку» самастойна і прыязджаць на трэніроўкі за паўгадзіны да іх пачатку. Ведае ўсіх прым — а калі не, значыць яны недастаткова славутыя. Сама дзяўчынка ўваходзіць у пяцёрку найлепшых юных танцоўшчыц свету. У лістападзе ў паўфінале аўтарытэтнага міжнароднага конкурсу Youth America Grand Prix мінчанка заняла першае месца. А ў снежні стала адной з пераможцаў расійскага тэлевізійнага конкурсу юных талентаў «Сіняя птушка». Расклад у Веры вельмі шчыльны, таму ў яе была ўсяго гадзіна, каб адказаць на нашы пытанні, паабедаць тварожнай запяканкай і пераадзецца са школьнай формы ў спартыўны купальнік. Вось яны, будні будучай прымы.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ Віншуем пераможцаў!

# МАДЭЛЬ САФІЙКА І ЧАТЫРЫ АСІЛКІ

### Вучні беларускамоўнай гімназіі № 23 выбралі пераможцу конкурсу «Беларусікі». А іх класны кіраўнік — найбольш запамінальную «вясёлкавую» падказку

**Беларускамоўная гімназія знаходзіцца непадалёк ад нашай рэдакцыі. Завіталі мы туды на Вадохрышча — завяршальнае свята каляднага цыкла народнага календара. Прыемна здзівіліся, калі ўслед за намі пад песню «Ой, калядачкі, бліны-ладачкі...» ў клас зайшла каза (у яе пераапранулася адна з пяцікласніц).**

Вучні 5-га ды 7-га класаў відавочна падрыхтаваліся да сустрэчы з журналістамі «Звязды». На іх партах быў сапраўдны зарапад: зоркі, вязаныя кручком ды зробленыя з гафрыраванага кардону, малюнкі з выявамі знічкі ды звязды (уважлівыя чытачы нашай газеты ведаюць, што так па-беларуску называецца калядны атрыбут — зорка на кіі, з якой хадзілі так званыя звездары)... Але больш за ўсё мяне ўразілі два хлопцы-пяцікласнікі: Янка Чабатаравіч сам спёк дома «зорную» піцу, а Мікіта Чуяшкоў — бліны-зорачкі.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «СГ».)*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.



Фота Святланы КІСЛАЙ.

Уладзіслаў Шаўчук з татам Сяргеем і мамай Святланай.

■ Першынец года

# 1255 КРОКАЎ ДА ШЧАСЦЯ

**КОЛЬКІ крокаў да шчасця? Сяргей і Святлана Шаўчукі з Жабінкі падлічылі: 1255. Менавіта праз столькі дзён пасля вяселля ў іх сям'і нарадзіўся сыночак. Уладзіслаў — першынец не толькі ў маладых мамы і таты, але і ўвогуле ў раёне: менавіта ён сваім нараджэннем «адкрыў» лік немаўлятак 2018 года на Жабінкаўшчыне.**

Бацькі вераць, што іх сыночак з'явіўся пад шчаслівай зоркай, таму 1 студзеня будзе прыносіць яму не толькі падарункі, але і ўдачу, здароўе і добры настрой.

— Я прачытала, што людзі, народжаныя 1 студзеня, становяцца лідарамі, умеюць дабівацца сваёй мэты, — расказвае маладая мама. — Не ведаю, як будзе далей, аднак ужо зараз менавіта сынок вырашае, калі нам, бацькам, можна паснедаць, адпачыць, паспаць. Клопаты вакол малечы — самыя прыемныя. Сяргей з радасцю дапамагае: ён па-майстэрску спавівае дзіця, мые ў ванначцы, падымаецца да Уладзіка ноччу, люляе. Я вельмі шчаслівая, што ў сынулі такі тата.

Святлана любіць трымаць немаўлятка на руках, углядацца ў тварык і знаходзіць у ім рысы каханага мужа.

— Уладзіслаў — тата Сяргей у мініяцюры, — кажа яна. — Падабаецца назіраць, як сыночак усміхаецца, як скручвае вусны трубачкай, нібыта нечаму здзіўляецца. Спадзяюся, што і характарам наш першынец пойдзе ў тату — будзе такі ж вясёлы, пазітыўны, душа кампаніі.

Часам у такія хвіліны Святлана згадвае тую першую і, як аказалася, лёсавызначальную сустрэчу ў цягніку: яны, абодва студэнты-трэцякурснікі (толькі Святлана вучылася на настаўніка матэматыкі і інфарматыкі, а Сяргей — на інжынера па інфармацыйных тэхналогіях), вярталіся з Брэста ў Жабінку з лекцый.

Ёй спадабаўся прывабны хлопец, яго манера разважаць, тонка жартаваць, умение падтрымліваць гутарку. А Сяргей адразу патануў у яе бяздонных вачах і зразумеў: вось яно, каханне і сэнс жыцця. І хоць легкакрылы Амур ужо злучыў іх закаханыя сэрцы, абодва вырашылі не губляць галавы і спачатку атрымаць дыпломы аб заканчэнні ВНУ. Толькі пасля здачы дзяржіспытаў згулялі вяселле. Сяргей уладкаваўся ў «Белтэлекам», а маладая жонка — настаўнічаць у трэцюю гарадскую школу № 3.

— Я самы шчаслівы чалавек, — кажа Сяргей. — Ёсць прафесія, якая прыносіць задавальненне, пачалі будаваць свой дом, жонка нарадзіла сыночка ды яшчэ ў першы дзень новага года. Чаго не хапае? Бадай, толькі дачушкі...

**Святлана БЯЛЯК**

■

■ Выбар за вамі...

# Жыццё на далоні



## Самарэалізавацца можна паспець пасля нараджэння дзіцяці, а вось стаць мамай пасля аборту не факт, што атрымаецца

**Пра аборт сёння гавораць па-рознаму. Адны параўноўваюць з забойствам, другія адстойваюць правы на яго — маўляў, навошта тое мацярынства, пакуль не рэалізавана свае задумы, не адвучылася, не атрымала работу, не абзавялася мужам...**

### Ты не адна!

*Шчаслівыя фоткі, жыццесцвярджальныя статусы і пяшчотныя каментарыі ў сацыяльных сетках. Хто ведае, ці распісаліся б гэтыя маладыя людзі, калі б Марыя (тут і далей імёны зменены) не захавала цяжарнасць. Магчыма б, яна і не сышлася з Паўлам, не заўважыла, які ён высакародны, сапраўдны, любячы... Сімпатычны малады хлопец, па якім не адна прыгажуня сохла, выбраў адзінокую дзяўчыну з дзіцем на руках, ды яшчэ ўсім знаёмым сказаў, быццам гэта яго малы. У многім дзякуючы таму, як ён сябе паказаў, Марыя і звярнула на Пашу ўвагу, пакахала.*

— Часам жанчыны кажуць: «Вось зацяжарыла ад нейкага ідыёта, ён мне не патрэбны». А дзе гарантыя, што калі яна выйдзе замуж за чалавека, якога будзе моцна кахаць, зможа з ім нарадзіць дзяцей? Альбо што праз некалькі гадоў пасля заканчэння ўніверсітэта ў яе ўсё будзе крута? Ды хіба замужняя жанчыны застрахаваныя ад таго, што ў нейкі момант не застануцца адны з дзіцем? Ці трэба так чапляцца за ўяўныя перспектывы, мары пра «забяспечаных хлопчыкаў» і крутую работу. Мы не будзем чапаць статыстыку бясплоднасці. Але чаму б не задумацца, навошта зараз жанчыне дадзена гэтая цяжарнасць? Усё ў жыцці можна паспець і пасля нараджэння дзіцяці, а вось стаць мамай пасля аборту можа і не атрымацца,— заўважае **Юлія ЯРАСЛАЎЦАВА — старшыня грамадскага дабрачыннага аб'яднання «Ратаванне немаўлят».**

Здаецца, як рэагаваць, калі ў арганізацыю ў істэрыцы тэлефануюць цяжарныя са словамі накшталт: «Балюча мне, страшна, аборт хачу!» Але калі жанчыны сюды звяртаюцца, яны ж ведаюць, што тут ад абортаў будуць адгаворваць. Значыць, сумняваюцца, шукаюць падтрымкі. І добра, калі ёсць месца, дзе прымуць, не папракнуць. Бывае, што чалавеку патрэбны нехта, хто сагрэе, калі няма каму паплакацца, з кім параіцца. Такім тут заўсёды кажуць: «Ты не адна, у цябе ёсць мы».

Пралайферы гатовы падтрымаць не толькі псіхалагічна (кансультацыі з прафесійнымі псіхолагам і гінеколагам). Будучым мамам, якім няма куды ісці, дапамогуць з жыллём і ўсім неабходным, навучаць, як даглядаць дзіця, і нават пастараюцца вырашыць праблемы з працаўладкаваннем.

З многімі мамачкамі арганізацыя гадамі падтрымлівае сувязь. Некаторыя падапечныя самі становяцца валанцёрамі. Так, адна з жанчын, якую ў арганізацыі некалі адгаварылі ад аборту, праз пэўны час сама кансультавала праблемную цяжарную: «Не будзе куды ісці з дзіцем, прыходзь да мяне. Я цябе прыму».

### Хросная Юля

Юля расказвае, што некаторыя жанчыны завуць яе «хроснай мамай». Адзінокія ці непрызнаныя блізкімі, без работы і з жыллёвымі праблемамі, яны захавалі зароджанае жыццё. *Як, напрыклад, Ірына. Яна задумалася пра аборт, калі прыгожыя адносіны з маладым чалавекамператварыліся ў пакуты, сужыцель пачаў выпіваць і пры гэтым паводзіў сябе неадэкватна, мог пабіць, абляць. Дзяўчына, якая баялася, што застанецца адна на вуліцы, усё ж вырашыла нарадзіць і пакінуць немаўля ў дзіцячым доме. Але і ночы не пратрымалася, са слязамі прыбегла: «Аддайце мне маю малышку, не магу без яе». А яшчэ ў дзіцячым доме яна ўбачыла хлопчыка-адказнічка і адчула, што гатова была б і яго забраць, каб магчымасці дазвалялі.*

**«Калі жанчыны да нас звяртаюцца, яны ж ведаюць, што тут ад абортаў будуць адгаворваць. Значыць, сумняваюцца, шукаюць падтрымкі. І добра, калі ёсць месца, дзе прымуць, не папракнуць».**

— Мая Іра, — пра мамачак, якім дапамагла, Юля расказвае як пра найлепшых сяброўак, — змагла тое, што змаглі б адзінкі. Упэўнена, што многія на яе месцы, нават на вялікіх тэрмінах, знайшлі б, як зрабіць аборт. Канешне, сэрца разрывалася ад болю, калі я даведалася, што яна падпісала адмову на дзіця, бо яна гэта зрабіла толькі таму, што баялася, ці зможа нешта даць дзіцяці. Але ў нейкі момант усё матэрыяльнае стала для яе другасным. Шкада, калі людзі думаюць, што галоўнае — забяспечыць дзіця. Хіба нельга быць шчаслівым без дарагіх цацак і адзення? Няўжо мы проста развучыліся радавацца жыццю, зносінам? Часта пралайфераў абвінавачваюць, што з-за іх нараджаюць сірот ці дзяцей, якіх пакідаюць у сметніцах. Гэта не так. Мы матывуем на мацярынства, паказваем, што гэта каштоўнасць. Калі сустракаешся з мамамі, якія вырашылі не перарываць цяжарнасць, бачыш, што прыярытэты ў іх мяняюцца. Напрыклад, адна проста да фанатызму марыла пра вышэйшую адукацыю. А нарадзіла дзіця, адчула, што хоча іншага. Насамрэч, дзіця нічога ніколі не адбірае. Яно толькі дае. Для многіх — гэта шанц пазбавіцца ад інфантыльнасці. Так, дзяўчына блукае: дыскатэкі, хлопчыкі. «А становіцца мамай, у яе з'яўляюцца клопаты і абавязкі, яна разумее, што ўсё, што было да гэтага — несур'ёзна, няважна. Мне вельмі шкада маладзенькіх дзяўчат-сірот, якіх ці не за шкірку цягнуць на аборты. А можа, у іх жыцці ніколі надзейнага мужчыны не будзе? Затое дзіця, у адрозненне ад мужыкоў, мамачку будзе любіць заўсёды.

### «Маладая яшчэ, пагуляць хачу...»

Мы гатовы прыняць і тых людзей, якія цвёрда рашыліся на аборт, магчыма, наступную цяжарнасць яны захаваюць. І такі выпадак быў.

— Увогуле, аборт часта выбіраюць не таму, што няма грошай. На яго ідуць і калі ёсць муж, які не супраць дзіцяці. Часам гутарыш з жанчынай і разумееш, што ёй не цяжарнасць замінае. Маўляў, з мужчынам праблемы, быццам, ён яе не кахае. Тут бы да сямейнага псіхолага ісці, а не на аборт бегчы. Часам гэта няўпэўненасць у сабе, адгаворкі накшталт «маладая, яшчэ пагуляць хачу». Хоць той, хто рана нараджае дзяцей, паспее, як правіла, паспяваюць самарэалізавацца. Ёсць і такія, хто шкадуе сябе, баіцца, што застанецца без работы і не зможа купіць норкавае футра. Грамадзянскія шлюбы — таксама часта прычына абортаў. Сённа мы разам, а праз год-два можам заявіць: «Ты мне ніхто». Калі мужчына не рашаецца зрабіць прапанову, ці не гаворыць гэта пра тое, што ён несур'ёзна ставіцца да жанчыны, карыстаецца ёй? Маладзенькія дзяўчаты перарываюць цяжарнасць пад прымусам родных. Так, мне тэлефанавалі мамы непаўналетніх і цікавіліся, дзе робяць аборт. Але я магу прывесці прыклады, калі ранняя цяжарнасць была захавана і, некалі злосныя і непрымірымыя, бабулі і дзядулі сёння душы не чуюць у сваіх унуках. На аборт часам ідуць нават, калі не задавальняе пол дзіцяці. На жаль, сёння інтэрнэт перапоўнены каментарыямі жанчын, якія пра спыненую цяжарнасць гавораць амаль як пра ўласную заслугу.

*Вольгу спыніць не было каму. Яна зрабіла аборт, калі ёй здалося, што муж здраджвае з найлепшай сяброўкай. Мужчына, калі даведаўся аб перарванай цяжарнасці, горка плакаў. Пра дзіця сужэнцы марылі дзесяць гадоў, але жанчына ніяк не магла зацяжарыць. Пара распалася. У яго з другой жонкай ужо двое дзетак. А Вользе ўрачы сказалі:» Пасля аборту вам ніколі не быць мамай».*

Перадабортнае кансультаванне патрэбна не толькі дзеля таго, каб захаваць жыццё будучага чалавечка, але і дапамагчы жанчыне, незалежна ад таго, які выбар яна зробіць. Пралайферы цікавяцца, што ў цяжарнай здарылася, раз яна сюды прыйшла. Часта гэта безліч розных праблем, з якімі працуюць прафесійныя псіхолагі.

І ўсё ж Юлія мяркуе, што кансультацыі цяжарных — гэта ўжо самы апошні і цяжкі крок, а дзіцячыя жыцці можна выратоўваць і іншым чынам. Да абортаў вядуць тысячы шляхоў, і каб папярэдзіць незапланаваныя цяжарнасці, трэба найперш працаваць з моладдзю. Калі непаўналетнія дзяўчаты тэлефануюць «незнаёмай цётцы» (пэўны час такіх званкоў у арганізацыю ішло вельмі шмат) і цікавяцца пра аборты, хіба гэта не сігнал, што трэба нешта рабіць? Цнатлівасць, сямейныя каштоўнасці — адна з тэм, якую валанцёры абмяркоўваюць разам з падлеткамі ў каледжах і школах; важна, каб маладыя людзі навучыліся несці адказнасць за сябе і за іншых.

— Не трэба думаць, што мы расказваем жахлівыя рэчы пра тое, што такое аборт, — запэўнівае Юлія. — Я паказваю ролік «Цуд жыцця» пра тое, як развіваецца дзіцятка. Цікава назіраць за рэакцыяй падлеткаў: яны расчуленыя, усміхаюцца, плачуць. Пасля бяруць у далоні ляльку — і дзівяцца, што некалі былі падобныя. У такія хвіліны я разумею: вось яна — маленькая перамога.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**

■

■ Незвычайнае побач

# Як рухавік ад старога грузавіка ператварыўся ў сучасны столік



**Кожнаму аўтааматару хочацца быць бліжэй да сваёй тэхнікі. Сяргей Руды падышоў да вырашэння гэтага пытання па-мужчынску. Мясцовы Кулібін выкарыстоўвае запчасткі аўто для стварэння ўнікальных і адзіных у сваім родзе прадметаў інтэр'еру.**

Сяргей Руды жыве разам з жонкай і двума сыночкамі ў вёсцы Навасёлкі Шчучынскага раёна. У свой час у яго тады была свая майстэрня па рамонце тэлерадыёапаратуры. Пасля заканчэння школы Сяргей вырашыў пайсці па бацькавых слядах і стаць радыёмеханікам. Але неўзабаве гэтая прафесія зусім зжыла сябе, і прыйшлося заняцца пошукам новай працы. Прадпрымальны хлопец адкрыў сваю справу і пачаў прадаваць абутак і скургалантарэю. Сапраўдная любоў да тэхнікі «прачнулася» пасля арміі. Як і ўсе хлопцы, Сяргей любіў падоўгу корпацца пад капотам свайго аўто, рамантаваць яго, мяняць дэталі. Аднойчы ўбачыў тэлеперадачу, дзе паказвалі стол з аўтамабільных дэталяў. Незвычайная задумка так спадабалася Сяргею, што ён неадкладна прыступіў да пошуку матэрыялу для свайго будучага шэдэўра.





— Успомніў, што ў знаёмага валяўся без справы рухавік ад старога савецкага грузавіка, — расказвае мужчына. — Неўзабаве я ўжо працаваў над ачысткай зашмальцаванай дэталі. Як аказалася, ачысціць да бляску стары рухавік — справа няпростая. У ход пайшлі сродкі для чысткі пліт, аксіляльнікі... Толькі праз тыдзень руплівай працы з'явіўся той самы доўгачаканы хромавы бляск. Пасля таго, як прывёў у парадак рухавік, Сяргей адшукаў шкло, іншыя неабходныя дэталі і змайстраваў аўтастол. Жонка Люба была першая, хто належным чынам ацаніў самаробны прадмет мэблі. Цяпер аўташэдэўр заняў ганаровае месца ў доме. У століка празрыстае верхняе шкло, таму госці лёгка могуць разгледзець яго з усіх бакоў. Прызнацца, нічога падобнага яшчэ не бачыла. Дарэчы, ніякага паху алівы, бензіну няма. Наогул з першага погляду здаецца, што рухавік абсалютна новы. І толькі майстар ведае, колькі сіл затрачана на такі вынік.

Стол — далёка не адзіны эксклюзіўны прадмет мэблі ў доме Рудых. Старая каробка перадач ад Аўдзі-100 ва ўмелых руках Сяргея ператварылася ў прыгожы таршэр, поршань — у модны настольны свяцільнік для сына. А якія прыгожыя гадзіннікі атрымліваюцца з дэталяў ад колаў! Гледзячы на мэблю, мусіш прызнаць, што ў стваральніка падобных шэдэўраў з густам усё ў парадку.

Свае работы Сяргей Руды не толькі пакідае сабе, але і дорыць сябрам і знаёмым, якія ўжо паспелі ацаніць вырабы маладога майстра. А яшчэ ў майго суразмоўніка ёсць група ў сацыяльных сетках, куды ён выкладае фота новых работ. Сяргей родам са Шчучына — горада авіятараў, можа, таму яго мара — зрабіць незвычайны стол з рухавіка... самалёта! Упэўнена, усё задуманае ў майстра атрымаецца!

**Ганна КАСПЕР**

■ Выпрабавана на сабе

# УДЫХ — ВЫДЫХ

## Наш карэспандэнт пазаймалася фізкультурай з пенсіянерамі

**«Калі ў мяне нешта не будзе атрымлівацца, не судзіце строга», — загадзя прашу прабачэння і далучаюся да заняткаў. Пакуль школу здароўя для пенсіянераў, што дзейнічае пры Тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Цэнтральнага раёна горада Мінска, наведваюць толькі жанчыны, хоць вельмі хочацца сказаць прадстаўнікам моцнай паловы: «Спадары, вы шмат губляеце, калі адседжваецеся па дамах». Я гадзіну «адпрацавала» ў зале разам з прыхільніцамі актыўнага ладу жыцця, пачула многа розных парад пра тое, як трэба харчавацца і дыхаць і выйшла адсюль з цвёрдым намерам заняцца сваім здароўем.**

— Генадзь Максімавіч, займаўся ў нас на камп'ютарных курсах і сам прапанаваў арганізаваць школу здароўя. Ён мае адпаведную адукацыю. Шмат гадоў вёў падобныя заняткі і, як бачыце, і сёння запатрабаваны, — адрэкамендавала кіраўніка гуртка **загадчыца аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Людміла АЎДЗЕЕВА.** — Людзі адразу адгукнуліся. Жанчыны, якія пастаянна сюды ходзяць, расквітнелі на вачах. Рэкамендацыі даюцца пад кантролем урачоў, у нас рэгулярна дзяжурыць медык.

Трэба сказаць, што Генадзь Карнюшка працаваў не толькі настаўнікам фізкультуры ў школе, але і старшым інструктарам у піянерскіх летніках, трэнерам у фізкультурна-аздараўленчых камбінатах. Некалі апошнія былі вельмі папулярныя, інжынеры, бухгалтары, рабочыя пасля працы беглі туды размяцца. Былі такія часы, што ў Генадзя Максімавіча займалася каля тысячы чалавек, запісацца да яго было цяжка. Нават з Масквы прыязджалі здымаць яго заняткі. Справа ў тым, што ён быў адным з першых інструктараў па аздараўленчай гімнастыцы. Мужчына распрацаваў уласную праграму, якая ўключала не толькі фізічныя, але і дыхальныя практыкаванні, элементы медытацыйных практык.

Перад пачаткам заняткаў у жанчын замяраецца ціск, і **Вікторыя ТАПАРАШ, загадчык аддзялення медыцынскай рэабілітацыі 16-й гарадской клінічнай паліклінікі,** пацвярджае, што сапраўды такая фізічная актыўнасць дае добрыя вынікі: «Стабілізуецца ціск, паляпшаецца псіхаэмацыянальны стан...»

Актыўная размінка змяняецца на практыкаванні на дыванках, прычым інструктар час ад часу каментуе, якая ад іх карысць. Напрыклад, адны добрыя для нырак, другія неабходныя, каб захаваць зрок, а трэція дапамогуць змагацца з маршчынкамі на твары. Заўважаю, што нашы заняткі насычаны дыхальнымі практыкаваннямі, паміж актыўнымі «элементамі» — невялічкія паўзы выкарыстоўваюцца для расслаблення і медытацыі.

У нейкі момант мне здаецца, што вярнулася на ўрок фізкультуры ў сваё школьнае мінулае. Але, акрамя класічных практыкаванняў накшталт тых жа «нажніц» ці «веласіпеда», сустракаю для сябе нешта новае.

— Ногі ў каленным суставе сагнутыя, прабіваем кулакамі галёнку, тазасцегнавы сустаў. Не шкадуйце, мацней біце, каб мышцы ажылі, пасля прастукваем рукі і шыю, — дае каманду інструктар. *(Пасля заняткаў Генадзь Максімавіч растлумачыць, што раней вывучаў масаж, таму некаторыя элементы з яго выкарыстоўвае ў сваёй праграме.)*

А яшчэ ў школе здароўя можна даведацца, дзе знаходзяцца антыстрэсавыя кропкі, ці тыя, якія варта расціраць, каб пазбавіцца ад галаўнога болю, навошта трэба масіраваць мочкі вушэй...

Калі бачу, як спадарыні на суседніх дыванках робяць энергічныя ўзмахі нагамі, крыўдна становіцца за сваіх родных, якія пакуль яшчэ не дайшлі да школ здароўя. І гэта пры тым, што разнастайныя актыўныя заняткі для людзей сталага ўзросту дзейнічаюць у розных раёнах Мінска. І сярод прапаноў можна знайсці не толькі фітнес для бабуль, але і заняткі ёгай, народныя, бальныя, усходнія танцы...



Генадзь КАРНЮШКА: «З узростам пагаршаецца каардынацыя. Паспрабуйце пасля 50 гадоў зрабіць практыкаванне «ластаўка» — рукі ў бакі, адну нагу (прамую, ці сагнутую ў калене) падняць. Колькі секунд вы пратрымаецеся?»

— Я займаюся з лістапада, і тут сапраўды вельмі добрая гімнастыка, — расказвае адна з удзельніц гуртка **Святлана КАРОБАЧКІНА.** — Адчула прыліў моцы, хочацца рухацца, радавацца жыццю. З мужам на дачы ўжо з вялікім энтузіязмам рабілі далёкія прагулкі, нават па сем кіламетраў, хадзілі ў іншы канец леса і ў суседнюю вёску.

— Дома так сістэматычна займацца не атрымаецца, заўсёды знойдзецца прычына, каб не рабіць ніякіх практыкаванняў. А тут сама атмасфера стымулюе, — падключаецца **Тамара САПОНЕНКА.** — Нягледзячы на тое, што на занятках не было вялікіх нагрузак, адчуваю, што добра размялася.



Перад заняткамі абавязкова замяраецца ціск.

— Неяк адна жанчына пахвалілася мне, што хадзіла на фітнес і зрабіла 200 прысяданняў. Непадрыхтаванаму чалавеку ні ў якім разе нельга даваць такіх нагрузак, — заўважае Генадзь Максімавіч. — Для некаторых людзей прысяданні наогул могуць быць шкодныя. Я раю пачынаць актыўныя заняткі з бегу — 30 метраў прабегчы, пасля столькі ж прайсці, з кожным днём адлегласць можна павялічваць, а праз паўгода чалавек можа адолець і кіламетр. Для пенсіянераў карысней будзе скандынаўская хада, але нават тут трэба ведаць, як дыхаць, як крочыць, задзейнічаць рукі, каб было больш карысці. Наогул, лічу, што людзям пажылога ўзросту патрэбны інструктар, цела можа назапасіць розных хвароб, таму спецыяліст павінен сачыць за заняткамі. Не менш важна і тое, што ад настаўніка ідзе станоўчая энергія. Напрыклад, я кажу на занятках: «Пазваночнік выраўняць, усміхнуцца, зняць маску напружання з твару».

***— І ўсё ж, што трэба зрабіць зранку, каб увесь дзень адчуваць сябе бадзёра?*** — цікаўлюся ў трэнера.

— Можна памасіраваць мышцы, зрабіць дыхальную гімнастыку. І перш чым брацца за звычайную зарадку з узмахамі рукамі, даць сабе ў думках каманду: «Я ўсміхаюся і зараджаю сябе на тое, каб сардэчна-сасудзістая сістэма і іншыя органы добра працавалі». Сярод абавязковых фізічных практыкаванняў я назваў бы павароты тулава (некалькі кругоў у левы і правы бакі), адцісканні (людзям старэйшага ўзросту можна адціскацца і ад стала, тумбачкі), разгібы назад (важна, каб чалавек быў гнуткі, так менш будзе праблем; напрыклад, вы заўважалі, як старыя людзі ходзяць з кіёчкам: спачатку палачка наперад, а за ёй рухаецца галава і тулава, гэта ўсё з-за зашчамлення сядалішчнага нерва). Маладзейшым мужчынам абавязкова патрэбна «фізуха» — пакачаць гіры, гантэлі, падцягнуцца на перакладзіне. Добрая падзарадка сардэчнай мышцы — невысокія скачкі (такое патрэсванне карысное для органаў), калі ў чалавека ва ўзросце не атрымліваецца скакаць з рукамі на поясе, можна адной рукой абапірацца на сцяну. У час выканання гэтага практыкавання не дрэнна падключыць гукавую размінку — праспяваць «О-О-О», «М-М-М».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**

■

# «МАРУ СТАЦЬ СЛАВУТАЙ БАЛЕРЫНАЙ»

## «На пуанты ўстала ў сем гадоў»

***— Калі ты ўлюбілася ў балет?***

— У тры з паловай гады. Да нас у дзіцячы садок прыйшла Марына Вежнавец (заслужаная артыстка і кіраўнік прыватнай балетнай школы. — **Аўт.**) і набрала ў студыю пяць чалавек. А я ў той дзень была дома, бо хварэла на вятранку. Пашанцавала, што мая бабуля працавала выхавацелем у тым дзіцячым садку. Яна папрасіла, каб ёй дазволілі потым прывесці ўнучку на прагляд.

***—Табе лёгка ўсё давалася?***

— Было крыху складана на першых занятках, а потым прывыкла. У мяне аказаўся жудасны пад'ём, але я яго неяк выправіла. Правільны пад'ём для балерыны — гэта важна. Расцяжка ў мяне ад прыроды добрая, таму вучыцца сядаць на шпагат было амаль не балюча. На пуанты я ўстала ў сем гадоў — звычайна дзяўчаты танцуюць на іх з дзесяці.

— Бабуля ў дзяцінстве марыла стаць балерынай, — далучаецца да размовы тата Кірыл. — А ў мяне і жонкі задаткаў не было. Я і педагогам кажу: не разумею, у каго пайшла Вера.



Разам з татам Кірылам, які цяпер таксама ўдзельнічае ў спектаклях, ды сваімі цацкамі-талісманамі.

— Тата цяпер танцуе ў балеце, — выдае па сакрэце дачка.

— На некаторых спектаклях для пэўных роляў патрэбны дарослыя. Вось мяне і падключылі, — тлумачыць Кірыл.

**— Зорная хвароба ў цябе не пачалася?**
**— А што гэта такое? Калі зоркі ў галаве?**

***— Шмат часу адымаюць трэніроўкі?***

— Працую 5—6 дзён на тыдзень, — расказвае пра свой графік Вера. — Калі гэта звычайная трэніроўка, то яна цягнецца паўтары гадзіны, а калі рыхтуюся да спектакля ці конкурсу, бывае і па пяць гадзін. Крыху стамляюся, але мне гэта падабаецца.

***— Няўжо ніколі не хацелася прагуляць трэніроўку? Пабегаць з аднакласнікамі, пасядзець у тэлефоне, паглядзець мульцікі?..***

— Не хацелася. Не люблю тэлефонныя гульні. Толькі калі на камлівасць — напрыклад, слова сабраць, пабудаваць сказ.

— Ніколі не было такога, каб Вера папрасіла: «Можа, давай адпачнём сёння?». Усе думкі ў яе толькі пра балет, — пацвярджае Кірыл.

***— Вучыцца паспяваеш?***

— Так. Калі ёсць вольны час, раблю дамашняе заданне на некалькі дзён наперад. Я добра вучуся. У мяне ў першай чвэрці ўсе дзясяткі былі — толькі адна дзявятка па нямецкай мове. Любімыя прадметы — матэматыка і фізкультура.

***— Ты выступаеш у спектаклях. Якія ролі твае любімыя?***

— Я танцавала Мэры, Аўрору (галоўныя персанажы спектакляў «Шчаўкунчык» і «Спячая прыгажуня». — **Аўт.**), Дзюймовачку, а яшчэ фею Дражэ, Арлекіна, кветкі, жукоў, камяні... Мне падабаюцца ўсе ролі. Больш за ўсё, вядома, галоўныя (*усміхаецца*).

***— Пра што думаеш, калі стаіш за кулісамі?***

— Успамінаю заўвагі, каб станцаваць яшчэ лепш. Перад выхадам на сцэну паўтараю рухі два-тры разы.

— Пасля спектакляў Вера выціснутая, як лімон. Іншыя дзяўчаты збіраюцца пагуляць, схадзіць у кавярню адзначыць, а яна хоча пабыць адна. Дачка аддае ўсе эмоцыі на сцэне.

## «Увесь клас за мяне «хварэе»

***— Ты паспела зняцца ў некалькіх тэлепраектах — «Танцуюць усе», «Сіняя птушка», «Лепш за ўсіх». Удзел у тэлешоу — чыя гэта была ідэя?***

— Не бацькоў, — адразу заўважае Кірыл. — Мы ніколі нікуды не тэлефанавалі і не пісалі. Арганізатары праектаў знайшлі нас праз сацыяльныя сеткі: самі звязаліся з намі і прапанавалі прыехаць. Да Максіма Галкіна паўтара года клікалі, усё не атрымлівалася. Хоць чуў, што на гэтыя праграмы шалёныя кастынгі. Складаней за ўсё было на праекце «Танцуюць усе» ў Кіеве.

— Трэба было ўставаць а чацвёртай гадзіне раніцы і развучваць танец, — успамінае Вера. — Заданні даваліся кожны дзень. Прыходзілася ставіць нумар самой, без педагога. А музыку можна было браць толькі тую, якую здаў перад конкурсам на флэшцы.

— Вера трапіла ў трыццатку найлепшых. Ёй тады толькі сем гадоў споўнілася, зусім маленькая. Але з-за вялікіх нагрузак мы самі адмовіліся ўдзельнічаць далей і з'ехалі.

***— Камеры не бянтэжылі?***

— Я на іх не звярнула ўвагі. Спецыяльна да здымак не рыхтавалася. Бабуля толькі перыядычна раіла, што сказаць. Яна заўсёды ездзіць са мной на конкурсы і спектаклі.

***— Зорная хвароба ў цябе не пачалася?***

— А што гэта такое? Калі зоркі ў галаве?

— Шчыра прызнаюся, не было такога, — усміхаецца Кірыл. — Калі Вера прыходзіць у балетную школу, усе дзяўчаты радуюцца за яе, віншуюць, а яна паводзіць сябе вельмі сціпла. Магчыма, часам наадварот трэба быць больш баявой, а дачка можа некага прапусціць наперад.

***— Шмат у цябе паклоннікаў?***

— Сярод хлопчыкаў іх, напэўна, няма. А з дзяўчат — увесь клас. Усе за мяне «хварэюць». Калі я была ў Парыжы, наша класная кіраўніца нават запісала для мяне відэа, дзе дзеці перадавалі мне прывітанне.

***— Дзякуючы балету ты, пэўна, аб'ездзіла шмат гарадоў?***

— Я была ў Санкт-Пецярбургу, Кіеве, Маскве, Мюнхене, Берліне, Вільнюсе... Хутка зноў у Нью-Ёрк палячу, у бізнес-класе. (*Да Кірыла*) Ну калі ласка, тата, у мяне шмат грошай.

— Вера, вось гэта зорная хвароба (*смяецца*). Яна ж атрымала грашовы прыз у «Сіняй птушцы» і папрасіла купіць ёй квіток у бізнес-клас. Калі мы першы раз ляцелі ў Амерыку, дачка праходзіла міма гэтых месцаў і пыталася: «Чаму мы тут не сядзім?»

— Там нават Малышава ляцела! Мы з ёй зрабілі сэлфі.

***— Удзел у конкурсах дорага абыходзіцца?*** — пытанне тату.

— Дорага. Каб выканаць адзін танец, трэба заплаціць 100 долараў. Пачка (балетная спаднічка) каштуе ад 200 долараў, калі яна расшытая камянямі Swarovski, — 400. А іх, як правіла, трэба некалькі. Даводзіцца зарабляць (у 2013 годзе Верыны бацькі адкрылі ў Мінску краму адзення і абутку для балета. — **Аўт.**). Але без удзелу ў конкурсах прагрэсу не будзе. Гэта вопыт. Нашмат прасцей танцаваць, калі ты ведаеш, да чаго ідзеш: перамога — зразумелая мэта.

***— Вы памятаеце ролі дачкі, ведаеце ўсё пра спаборніцтвы... Тата, які настолькі ў тэме танцаў, — гэта рэдкасць.***

— Я проста рэгіструю Веру на конкурсы, квіткі набываю. Запрашэнні таксама на мяне высылаюць, — усміхаецца Кірыл.

## «Гуляю з лялькамі ў балетную школу»

***— Вера, ёсць у цябе куміры ў балеце?***

— Вельмі шмат. Наталля Дудзінская, Марына Сямёнава, Ала Шэлест, Наталля Осіпава... Я пазнаёмілася з Іванам Васільевым (вядомым артыстам пецярбургскага Міхайлаўскага тэатра. — **Аўт.**). Нават рэпетавала з ім на «Сіняй птушцы».

— Дачка вельмі шмат ведае пра балет. Яна любіць глядзець перадачу «Абсалютны слых» Генадзя Яніна, дзе расказваюць пра гісторыю гэтага віду мастацтва.

***— І што, раней інакш танцавалі?***

— Вядома. Тады ногі так высока не падымалі — толькі 90 градусаў і ўсё, — дзеліцца дзяўчынка.

***— Што самае складанае ў балеце?***

— (*Задумваецца*) Танцаваць без эмоцый. Ёсць такія ролі. Мне падабаецца іграць і злых, і добрых персанажаў. І катоў — толькі я іх ні разу не іграла.

***— Танцоўшчыцам неабходна быць лёгкімі і зграбнымі. На дыеце прыходзіцца сядзець?***

— Дыеты ў нас дакладна няма, — адказвае тата. — Проста правільнае харчаванне: мама — фанатка гэтай справы. Вера есць усё, толькі ў нармальнай колькасці. Адзінае, у чым, магчыма, абмяжоўваем, — гэта салодкае.

— Вельмі люблю белы шакалад. Мне дазваляюць яго есці раніцай.

***— Чым займаешся ў вольны час?***

— Люблю гуляць з лялькамі ў балетную школу. Расстаўляю іх у лінію, і яны трэніруюцца. Добра ўсё робяць, стараюцца. Часам лялькі хварэюць, і я займаюся сама з сабой. Яшчэ іграю на фартэпіяна і спяваю — да мяне дадому прыходзіць па суботах педагог па музыцы. Мне гэта таксама падабаецца.

— Настаўніца кажа, што ў яе абсалютны слых. Яна найграе мелодыю — Вера тут жа паўтарае. Ёй усё даецца лёгка.

***— Як стаць найлепшай балерынай?***

— Трэба працаваць. Пасля школы я дома сама займаюся: расцягваюся, раблю практыкаванні.



За кулісамі.

**«Люблю гуляць з лялькамі ў балетную школу. Расстаўляю іх у лінію, і яны трэніруюцца. Добра ўсё робяць, стараюцца. Часам лялькі хварэюць, і я займаюся сама з сабой».**

— У балеце самае галоўнае — працаздольнасць. Задаткі можна развіць, — згаджаецца тата. — Для мяне таленавітае дзіця — тое, якое любіць працаваць. Бывае вельмі шкада дачку пасля чатырох гадзін рэпетыцыі. Але калі бачу, як гараць у яе вочы, адразу ўсё забываю. Мне здаецца, Вера знайшла сваё.

***— У цябе патрабавальныя бацькі?***

— Сярэдне. А бабуля патрабавальная.

— Я дачцэ заўсёды кажу, каб атрымлівала ад любой справы задавальненне. Не трэба перажываць, што не выйграеш. Бо калі табе падабаецца тое, чым займаешся, гэта ацэняць і гледачы, і суддзі.

— Якая гадзіна? — хвалюецца Вера.

— Дзве гадзіны.

— А дакладна?

— Дзве гадзіны дзесяць хвілін.

(*Да нас*) Дачка вельмі пунктуальная. Прымушае мяне за паўгадзіны прывозіць яе на трэніроўкі. Калі прыязджаем за пяць хвілін, у Веры слёзы.

***— Куды збіраешся паступаць далей?***

— Пакуль яшчэ не ведаю. Ці ў мінскі каледж мастацтваў, ці ў Санкт-Пецярбург.

— Прапаноў насамрэч нават цяпер вельмі шмат: Масква, Мюнхен, Берлін... Таму пытанне адкрытае. Вера яшчэ маленькая — у каледж балерыны ідуць з пятага класа, а яна зараз вучыцца ў трэцім. Хоць некаторыя ўжо завуць: дачка высокая для свайго ўзросту і прафесійна гатовая. Але тут шмат нюансаў. Цяперашні педагог Марына Вежнавец ведае магчымасці Веры, а ў любой замежнай акадэміі дачка будзе рабіць усё з самага пачатку. Хоць ужо сёння яна выконвае праграму дзяўчат 13—14 гадоў і ні ў чым ім не саступае. Вядома, з табой могуць займацца індывідуальна, але будзе гэта ці не, ніхто загадзя не скажа.

***— Пра што марыш?***

— Сустрэць усіх сваіх куміраў. І стаць славутай балерынай. Хачу танцаваць у Англійскім Каралеўскім тэатры «Ковент-Гардэн», бо там выступае Наталля Осіпава. А можа, буду, як Ірына Калеснікава, танцаваць адразу ў трох тэатрах.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ**
**і з сямейнага архіва гераіні.**



Бацькі Веры трымаюць краму адзення і абутку для балета.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

# «Наш дом згарэў... Тата пабудуе новы»

## Замест наваселля маладая сям'я з Бешанковічаў склікае талаку

**Гадоў дзесяць таму ў бацькоў маіх знаёмых згарэла хата. Пагарэльцаў, пакуль тыя не пабудавалі сабе новае жытло, прытулілі суседзі. У тым, што свет не без добрых людзей, пераканалася і сям'я Рамановічаў, якая некалькі месяцаў таму засталася без дома сваёй мары.**

### «Які сэнс плакаць? Трэба жыць далей»

З Уладзімірам Рамановічам ды яго жонкай Аляксандрай я пазнаёмілася на адным з кірмашоў вырабаў ручной работы. Набывала ў іх беларускую азбуку ў выглядзе магнікаў на лядоўню. Уладзімір тады расказаў, што будуе дом з саламяных блокаў. Радаваўся, як дзіця, бо да наваселля заставаліся лічаныя месяцы. Паводле яго слоў, жытло было практычна гатовае, заставалася толькі паставіць вокны ды аздобіць яго ўнутры.

У хуткім часе ў сацыяльных сетках прачытала, што недабудаваны дом Рамановічаў згарэў...

Другая мая сустрэча з творчай сям'ёй адбылася ля Бешанковіцкага аўтавакзала. Найперш мы пайшлі глядзець саламяны дом. А дакладней тое, што ад яго засталося.

*— Пра вашу бяду я прачытала ў сацсетках. А хто вам паведаміў дрэнную навіну? — цікаўлюся па дарозе.*

— Патэлефанавалі з міліцыі і сказалі: «Падыдзіце, ваш дом згарэў», — успамінае Уладзімір. — Здарэнне адбылося напрыканцы лістапада, у ноч з суботы на нядзелю. Калі я падышоў, яшчэ працавалі пажарнікі. Першая думка, якая ўзнікла ў маёй галаве: трэба павыкручваць шрубы, ураталаваць дошкі, якія моцна не пашкодзіў агонь. Вядома, для новага дома яны ўжо не прыдатныя, але мы іх выкарысталі для плота. А жонка пабачыла папялішча і адразу ў слёзы.

— Ну, я паплакала крыху... Столькі ж часу і сіл у гэты дом было ўкладзена... Але потым узяла сябе ў рукі. У мяне моцны характар. Хоць, па шчырасці, псіхалагічна было вельмі цяжка, асабліва першы тыдзень. У нашай сям'і спачатку гучалі такія дыялогі: «Так, дзе мае боты?... — Згарэлі... — Дзе нажніцы?... — На папялішчы...» Лічу, што мы абышліся малой крывёй: самі жывыя-здаровыя і з дзеткамі ўсё ў парадку. Нам не спатрэбілася звяртацца да псіхатэрапеўтаў. Хоць я спачатку непакоілася за сыноў, бо ў іх з'явілася дзіўная гульня, якая біла па нервах. Марыюш з Мілашам бегалі па кватэры з крыкамі: «Пажар, пажар!..» Цяпер дзеці ўсім кажуць: «Наш дом згарэў... Тата пабудуе новы». Мы з мужам таксама настроены аптымістычна. Рукі ёсць, галава на плячах — таксама, справімся. Асноўны шок мы перажылі. Які сэнс цяпер плакаць? Трэба жыць далей, нешта рабіць.

*— Не адмовіліся ад мары пра саламяны дом?*

— Пасля пажару шмат хто раіў нам аддаць перавагу цэгле ці блокам. Але мы, нягледзячы ні на што, і сваю новую хату на месцы спаленай будзем узводзіць з саломы. Хочам, каб нашы дзеці раслі ў экалагічным доме. Акрамя таго, нам не давядзецца перарабляць падмурак, зроблены адмыслова пад саламяны будынак. Больш за тое, такі дом патрабуе менш выдаткаў на ўзвядзенне, а потым — на ацяпленне.

Прычына ж пажару не ў саломе. І драўляныя дамы гараць. За мяжой выпрабавальнікі праводзілі процьму тэстаў і даказалі: саламяныя блокі, пакрытыя глінна-вапнавым ды супрацьпажарным слаямі, — надзейны напаўняльнік і ўцяпляльнік у будаўніцтве, у непрадбачаных выпадках толькі абвугляцца, але не згараць. Мы дагэтуль не ведаем дакладную прычыну пажару. Пажарнікі нас запэўнілі: гэта або падпал, або неасцярожнае выкарыстанне агню. Хутчэй за ўсё, хтосьці зайшоў унутр, каб пагрэцца, уключыў гарэлку ці кінуў непатушаную цыгарэту... Калі б я паспеў затынкаваць сцены знутры, магчыма, агонь распаўсюджваўся б не так хутка і яго б патушылі.





Дом мары сям'і Рамановічаў да пажару і пасля.

### «Цешча прыходзіла падыхаць саламянымі сценамі...»

*— Што можаце параіць сем'ям, якія, не дай бог, трапяць у такую сітуацыю?*

— Не абвінавачваць адно аднаго, — кажа Уладзімір і прыабдымае жонку. — Маўляў, ты не дагледзеў... Гэта не тая сітуацыя, калі варта высвятляць адносіны. Трэба адно аднаму старацца дапамагчы, падтрымаць словам, а лепш справай. Чым больш паразумення, тым больш энергіі ідзе на вырашэнне праблемы. А яшчэ не саромейцеся шукаць падтрымкі сярод суседзяў, сваякоў. Людзі, даведаўшыся пра нашу бяду, дапамагалі, чым маглі: хто капейкай, хто парадай. Нехта падказаў, што маем права, як пагарэльцы, набыць 50 кубоў лесу на льготных умовах. Зараз збіраем патрэбныя дакументы. Некалькі валанцёраў прыехалі і дапамаглі разабраць наступствы пажару. Пасля такога ў нас з Сашай яшчэ больш выраслі крылы, бо пабачылі, што мы не адны са сваёй бядой.

— Бяда паказала, што самыя блізкія сябры могуць не падтрымаць, а амаль чужыя першымі прыходзяць на дапамогу, — дадае Аляксандра. — Адгукнуліся тыя, пра каго мы нават не ведалі, ад каго не чакалі падтрымкі. Адзін сусед пабачыў нашу трагедыю і кажа: «Сёння не магу падысці, бо працую, але заўтра скажыце, што магу зрабіць». На наступны дзень ён дапамог нам паставіць плот. Былі і тыя, хто на просьбу аб дапамозе махаў рукой: «Ой, задарма працаваць, шукай дурняў». Некаторыя наогул шакавалі сваёй рэакцыяй: «Згарэў дом? Ну, так вам і трэба!»



Улетку Аляксандра з сынамі дапамагалі Уладзіміру на будоўлі.

Пра ўласнае гняздзечка сям'я Рамановічаў марыла з першага дня вяселля.

— Вось ужо шосты год мы жывём разам з Сашынай маці. Не буду наракаць, з цешчай мне пашанцавала. Але, пагадзіцеся, пяць чалавек на двухпакаёвую кватэру гэта зашмат. Таму новабудоўля была для нас аддушынай.

— Мы туды прыходзілі нават проста пасядзець у цішыні, пабыць сам-насам.

— Цешча любіла прыйсці падыхаць саламянымі сценамі. Я ўжо пралічыў, што каб іх аднавіць, спатрэбіцца дзесьці тысячы тры долараў. З нуля ж жыллё з саламяных блокаў для чатырох чалавек можна пабудаваць тысяч за дзесяць пад ключ, з аддзелкай.

### «Хацелася б, каб да верасня ў Марыюша быў асобны пакой»

*— Адкуль цікавасць да саламянага будаўніцтва? — пытаюся ва Уладзіміра.*

— У мяне ў свой час у Мінску быў хостэл. За яго арэнду даводзілася плаціць шалёныя грошы. Таму я пачаў шукаць тэхналогію, якая дазволіла б у перспектыве зрабіць экалагічны, недарагі гатэль.

Пра саламянае будаўніцтва расказаў мне тата. Кажа, перспектыўная рэч, пачытай. Я спачатку паставіўся да такой прапановы скептычна, думаў, што гэта такое жыллё, як у Ніф-Ніфа з казкі пра трох парасят. Аказалася ж, што каркасны дом з натуральным уцяпляльнікам — прыдатны для жыцця і спрыяльны для здароўя. Дарэчы, нядаўна прачытаў, што ў Швейцарыі ўжо пабудавалі гатэль з саламяных блокаў. Мару туды з'ездзіць, паглядзець на свае вочы.

*— Чула, што некалькі гадоў таму настаўнік з Докшыцкага раёна таксама пабудаваў саламяны дом... Але ж ён у свой час вучыўся на будаўніка, нават навуковую работу пісаў на гэтую тэму. А ў вас адкуль досвед?*

— Я раней працаваў у фірме, якая займалася вырабам корпуснай мэблі. Там атрымаў багаты досвед і зразумеў, што пабудаваць дом — гэта амаль тое ж самае, што сабраць шафу. Проста трэба ведаць асноўныя канструкцыйныя вузлы. Перш чым заліць падмурак, шмат чытаў спецыялізаванай літаратуры, будаўнічыя форумы, кансультаваўся са спецыялістамі. Ёсць людзі, у якіх шмат грошай, ім прасцей наняць будаўнікоў. Мне ж цікава ва ўсім разабрацца самому, больш за тое, гэта істотна эканоміць грошы.

Наваселле Рамановічы плануюць зладзіць ужо сёлета. Зараз Уладзімір актыўна ўдасканальвае праект свайго будучага дома ў камп'ютарнай праграме.

— Наш старэйшы сын Марыюш 1 верасня пойдзе ў першы клас. Хацелася б, каб у яго быў асобны пакой, — кажа Аляксандра.

— Новы дом, думаю, пабудую хутчэй, — абнадзейвае каханую Уладзімір. — За пяць гадоў руку я ўжо набіў, тэхналогію асвоіў, ведаю, на якія граблі лепш не наступаць. Канешне, цяпер добра было б знайсці памочнікаў для хутчэйшага аднаўлення. Я ў сваю чаргу ўзамен за дапамогу гатовы падзяліцца сваімі ведамі. У валанцёраў будзе цудоўная магчымасць не толькі папрацаваць у добрай кампаніі, але і адкрыць для сябе тэхналогіі таннага экалагічнага будаўніцтва. Што каштоўна — адаптаванага да нашых рэалій. У прыватнасці, я не знайшоў гаспадаркі, якая гатова прадаць для будаўніцтва салому, сабраную ў цюкі, і навучыўся рабіць блокі з распушчаных рулонаў. У лютым вывешу на сваёй старонцы «УКантакце» абвестку аб план, дзе будзе бачна паслядоўнасць работы.

Дарэчы, калі нехта таксама захоча падтрымаць сям'ю Рамановічаў у няпросты для іх час, можна аддаць перавагу рэчам з беларускім каларытам — замовіць школьныя сшыткі, альбомы для малявання, жаночыя ўпрыгажэнні, паштовыя канверты, вязаныя шапкі ды шалікі з арнаментам ці штосьці яшчэ праз інтэрнэт-краму belarusam.by.

Планы ва Уладзіміра Рамановіча, як бачыце, грандыёзныя. Пасля таго, як адновіць свой дом, думае развіваць тэму экалагічнага будаўніцтва ў нашай краіне. Хоча будаваць з саламяных блокаў не толькі жылыя дамы, але і дзіцячыя садкі, гандлёвыя павільёны.

— Мы, рамеснікі, плацім шалёныя грошы за ўдзел у кірмашах. Але большасць арганізатараў не надта клапоцяцца, каб у нас быў вынік. За два дні можна нават не адбіць арэнду, бо натоўпу людзей не будзе. Прычыны могуць быць розныя: альбо месца для кірмашу выбралі нязручнае, альбо рэклама была дрэнная. З такой сітуацыяй мы з жонкай сутыкнуліся ў Гродне, знаёмыя — на апошнім сталічным калядным кірмашы ў Палацы мастацтваў. Цудоўна было б нам, рамеснікам, аб'яднацца і пабудаваць ва ўсіх абласных цэнтрах сталыя павільёны з саламяных блокаў. Я мог бы дамовіцца з гарадскімі ўладамі аб выдзяленні месцаў. Ну, і вядома, не адмаўляюся ад думкі зарабіць грошы на першы ў нашай краіне экагатэль. Там буду прымаць турыстаў і ладзіць семінары па саламяным будаўніцтве.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*Мінск—Бешанковічы—Мінск.*

■ Урокі жыцця

# СЛОІК МЁДУ

**Хачу расказаць пачутую мной гісторыю, якая можа даць адзін з адказаў на пытанне: што рабіць, каб дзеці паважалі сваіх бацькоў.**

Міхасёвы бацькі мелі ўласную пасеку. Лішкі мёду па прымальным коште прадавалі аднавяскоўцам. Поспехі ў пчалярстве ў значнай ступені залежаць ад капрызаў надвор'я. Калі на дварэ халодна і дажджліва, пчолкі сядзяць у вуллях і цярпліва чакаюць сонечных дзянькоў, каб потым збіраць нектар. І вось аднойчы напрадвесні пасля неўраджайнага года на сямейным савеце было вырашана: «Больш мёду прадаваць не будзем, а той, які застаўся, пакінем для сябе».

Праз некалькі дзён да іх у хату завітала жанчына і папрасіла прадаць мёду. «У нас больш няма», — сказала маці. Жанчына заплакала, сказала, што ёй вельмі патрэбны мёд для хворага дзіцяці. Міхась у гэты час сядзеў на печы. Яму стала шкада тую жанчыну. Захацелася крыкнуць: «Няпраўда, у нас яшчэ ёсць мёд!», але пры гэтым стаць здраднікам. Вуліца вучыла не толькі дрэнаму, а, напрыклад, таму, што самы агідны ўчынак — здрада, асабліва ў той пасляваенны час. А жанчына працягвала плакаць. Нарэшце маці сказала: «Добра, пагляджу, напэўна, у нас яшчэ трошкі засталося». У Міхася адлегла ад сэрца.

Напрыканцы свайго аповеду Міхась мне сказаў: «Ведаеш, Мікола, што было б, калі б яны той мёд не прадалі? Я перастаў бы іх паважаць».

**Мікалай СТАРЫХ,** *г. Гомель*

**12 февраля 2018 года в 12.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «НеоТрейдЗапад» по адресу: г. Гродно, ул. Гаспадарчая, 8, тел. 431517**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2017 год и основные направления деятельности Общества в 2018 году.

Отчет Наблюдательного совета Общества.

Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчетов о прибылях и убытках Общества за 2017 год.

О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков Общества за 2017 год.

Утверждение основных направлений использования прибыли в 2018 и в первом квартале 2019 года.

Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

О сделках Общества.

Дата составления списка владельцев ценных бумаг для регистрации участников собрания – 31.01.2018 г.

УНП 500167057

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 400/С-78079 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – здание кафе), площадью 515,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Ткацкая, 4 |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 440100000001007129, (назначение – земельный участок для обслуживания здания специализированного для общественного питания (кафе)), площадью 0,0984, расположенный по адресу: г. Гродно, ул. Ткацкая, 4. Примечания: земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохраной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью 0,0984 га; земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код 13,2, площадью 0,0130 га |
| Начальная цена продажи | 178 230 руб. (сто семьдесят восемь тысяч двести тридцать рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 17 823 руб. (семнадцать тысяч восемьсот двадцать три рубля) |
| Условия аукциона | Аукцион без условий |
| Продавец | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия оплаты | Рассрочка платежа за приобретаемое имущество сроком на три года, с уплатой первоначального взноса до подписания договора купли-продажи в размере 20 % от договорной стоимости, с погашением оставшейся суммы ежемесячно равными долями, начиная с месяца, следующего после заключения договора купли-продажи |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 19 февраля 2018 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 10.11.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 13 февраля 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | – капитальное строение, инв. № 450/С-1784 (назначение – здание обрабатывающей промышленности иного назначения, наименование – цех по производству гофротары), площадью 204,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная, 3А;<br>– капитальное строение, инв. № 450/С-1783 (назначение – здание нежилое, наименование – склад), площадью 29,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная, 1;<br>– капитальное строение, инв. № 450/С-28498 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – газопроводная сеть), протяженностью 34,1 м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная;<br>– капитальное строение, инв. № 450/С-28500 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 2,7 м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная;<br>– капитальное строение, инв. № 450/С-28501 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – кабельная линия электропередачи напряжением 10 кВ), протяженностью 114,3 м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная;<br>– капитальное строение, инв. № 450/С-28499 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 31,7 м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная;<br>– котел газовый АОГВК-354-1 (установлен в здании цеха по производству гофротары);<br>– система средств охранной сигнализации – приемо-контрольный прибор «АЛАРМ-5» с выходом на пульт центрального наблюдения Слонимского ОДО МВД РБ и объемные извещатели ИНС-110 в помещениях (установлено в здании цеха по производству гофротары) |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 425450100001000400, (назначение – земельный участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности), площадью 0,0905, расположенном по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная, 1 |
| Начальная цена продажи | 15 288 руб. (пятнадцать тысяч двести восемьдесят восемь рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 1 529 руб. (одна тысяча пятьсот двадцать девять рублей) |
| **ЛОТ 3** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Полуавтомат роторно-просекательная машина ВК940*2000 для изготовления гофротары (предназначен для высечки картонного кроя) |
| Начальная цена продажи | 5 976 руб. (пять тысяч девятьсот семьдесят шесть рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 597 руб. (пятьсот девяносто семь рублей) |
| **ЛОТ 4** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Станок для двухцветной флексопечати С2ФМ (предназначен для нанесения одно-двухцветной флексопечати на многослойный картон, производительность 1500 листов/час) |
| Начальная цена продажи | 4032 руб. (четыре тысячи тридцать два рубля) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 403 руб. (четыреста три рубля) |
| Условия аукциона | Аукцион без условий |
| Продавец | Филиал «Слонимский хлебзавод» ОАО «Гроднохлебпром», 231800, г. Слоним, ул. Чкалова, 6, 8 01562 503-31 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 20 февраля 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 23.09.2017 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 14 февраля 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Агросервис»**

Лот № 1. **Капитальное строение с инв. № 700/С-90254 – компрессорная** площадью 11,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, пер. Урожайный, 1Б/1. Назначение: здание неустановленного назначения. Составные части и принадлежности: одноэтажное металлическое здание компрессорной с мощением асфальтобетонным, ограждением железобетонные плиты на железобетонных столбах. Сведения о земельном участке: лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 740100000007005659 площадью – 0,7860 га (право аренды, доля в праве 2/3), назначение: земельный участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в т. ч. автомобильных заправочных и газонаполнительных станций), расположен по адресу: г. Могилев, пер. Урожайный, 1. Отдельный земельный участок для обслуживания компрессорной будет выделяться после продажи здания.

Начальная цена продажи: 54 149,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка – 5 414,90 бел. рублей.

Лот № 2. **Капитальное строение с инв. № 700/С-100457 – здание склада № 1** площадью 22,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, пер. Урожайный, 1В/1. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: одноэтажное металлическое здание склада № 1 с ограждением железобетонные плиты на железобетонных столбах.

**Капитальное строение с инв. № 700/С-100458 – здание склада № 2** площадью 32,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, пер. Урожайный, 1/4. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: одноэтажное металлическое здание склада № 2.

**Капитальное строение с инв. № 700/С-100456 – здание гаража** площадью 40,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, пер. Урожайный, 1/2. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта. Составные части и принадлежности: одноэтажное металлическое здание гаража.

**Капитальное строение с инв. № 700/С-87173 – мощение** площадью 7071 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, пер. Урожайный, мощение территории пер. Урожайный, 1В. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства. Составные части и принадлежности: сооружение мощения, состоящее из ограждения металлической сетки на металлических столбах, ограждения металлической сетки на бетонном цоколе, демонстрационной площадки.

Сведения о земельном участке: здания, входящие в состав лота № 2 расположены на земельном участке с кадастровым номером 740100000007005718 площадью – 0,7879 га (право постоянного пользования), назначение: земельный участок для размещения объектов автомобильного транспорта, расположен по адресу: г. Могилев, пер. Урожайный, 1В.

***Начальная цена продажи: 103 260,84 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 10 326,08 бел. руб.***

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ОАО «Агросервис», УНП 700010487, г. Могилев, ш. Славгородское, 44а |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, МФО BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 27 февраля 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 26 февраля 2018 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | Победитель аукциона обязан в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи. Оплата производится на условиях заключенного договора купли-продажи |

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); представившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации, копии учредительных документов, копию документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; индивидуальные предприниматели Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации и документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц и индивидуальных предпринимателей – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранные индивидуальные предприниматели – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представители иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованную в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условие – наличие не менее 2 участников. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, в соответствии со счет-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8 0222) 72-41-14, 8 029 624-26-25, 8 044 738-18-99**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29 |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1. Нежилое помещение № 3** (помещение, не относящееся к жилищному фонду), общ. пл. **64,9 кв. м,** инв. номер **400/D-101856, Гродненская обл., г. Гродно, ул. Соломовой, д. 137, пом. 3. Начальная цена с НДС 20 % – 77 482,32 бел. руб.**

**Лот № 2. Встроенное помещение (магазин)** (торговое помещение), общ. пл. **175,5 кв. м,** инв. номер **630/D-38885, Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Притыцкого, 4. Начальная цена с НДС 20 % – 311 975,59 бел. руб.**

**Обременения.** Лоты № 1, № 2 обременены договорами аренды

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан произвести оплату в размере 100% стоимости имущества не позднее **30** календарных дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Передача имущества победителю аукциона, заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 рабочих дней с момента внесения оплаты в размере 100 % стоимости недвижимого имущества.

Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.

Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением договора купли-продажи, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **02.03.2018** в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **28.02.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17 280-36-37; +375 29 183-69-71.<br>Email: auction@cpo.by |

■ Фотаздымак з гісторыяй

# Дабаўлялі гады, каб хутчэй пайсці зарабляць на хлеб...

Калі пачалася вайна, сям'я маёй прабабулі, Ніны Пташкінай, жыла ў Мінску. Горад вельмі моцна бамбілі фашысты. Людзі хаваліся ў падвалы, уцякалі невядома куды. Пасля першага налёту ад многіх дамоў засталіся толькі руіны, жыць не было дзе. Праз некалькі дзён сям'я прабабулі аказалася ў вёсцы. Яе бацька, былы сібірак, адразу пайшоў у партызаны, быў падрыўніком (у 1943 годзе загінуў, выконваючы заданне). Маці адна засталася з малымі дзецьмі на руках: сямігадовая Ніна — гэта мая прабабуля, пяцігадовая Вольга, а таксама зусім малыя Іван і Мікалай. Ніна часта хадзіла да немцаў па малако ці хлеб: маці пасылала, бо есці не было чаго. Бывала, штосьці давалі, а другі раз гналі, усяляк абзываючы, але не стралялі. У хуткім часе маці і двое маленькіх яе сыноў памерлі ад тыфу, а дзяўчаткі засталіся жыць. Напэўна, такі іх лёс... А магчыма, як кажа мая бабуля: «Крэпкая» я была, сібірачка ўсё ж». Ваенныя гады перажылі ў хаце мачахі ў голадзе ды холадзе (бацька паспеў ажаніцца, ён загінуў пазней, чым памерла маці).

Помніцца прабабулі Дзень Перамогі. Усе людзі былі шчаслівыя, радасныя, але плакалі. Перажылі вайну, засталіся жыць, марылі пра будучыню, мірнае жыццё, вучобу, працу, аднаўленне гарадоў, вёсак. З вокнаў некаторых хат чуліся песні, музыка, а з некаторых — моцны плач, галашэнне, бо туды ўжо ніколі не вернуцца родныя.



Удзельнікі мастацкай самадзейнасці дзіцячага дома, 1949 год. Мая прабабуля — першая справа.

Ніна з сястрой Вольгай былі разгубленыя, не ведалі, што іх чакае далей. Мачаха мела сваіх дзяцей, чужыя былі «лішнімі ратамі», ды і памочніцы ў гаспадарцы яшчэ слабыя. Прыехаў родны дзядзька, брат нябожчыцы маці, які працаваў дырэктарам Лідскага педвучылішча, забраў дзяўчат на Гродзеншчыну, аддаў іх там у дзіцячы дом.

Ізноў голад, холад, папрашайніцтва ў вясковых людзей хлеба ці бульбы... Але вялікае жаданне жыць, вучыцца ды працаваць перамагло. Напэўна, так чалавек створаны, што ў яго пастаянна ёсць нейкая надзея на лепшае, бо інакш не перажылі б тое ваеннае ліхалецце, а таксама складанасці пасля вайны. Прабабуля ўспамінае і шмат цудоўнага з жыцця ў дзіцячым доме. Я ўяўляю, як яна была старшынёю піянерскай дружыны, як ёй рапартавалі «за Леніна — Сталіна», як яна старанна вучылася, умела сябраваць, марыла пра каханне...



Здымак зроблены на фоне дзіцячага дома ў Лунне Гродзенскай вобласці, 1949 год. Пяцікласніца Ніна Пташкіна ў верхнім радзе трэцяя злева.

Скончыўшы школу ў дзіцячым доме, Ніна пераехала да свайго дзядзькі, вывучылася на бібліятэкара і сустрэла свайго каханага, з якім пражыла больш за 50 гадоў. Яны пабудавалі дом, нарадзілі чацвярых дзяцей, далі ім вышэйшую адукацыю.

Вось такі лёс чалавека ваенных гадоў. А колькі іх, такіх лёсаў? Шмат, не пералічыць. Колькі людзей не бачылі магіл сваіх продкаў, так, як і мая прабабуля, якая не ведае нават, калі яна нарадзілася, дзе пахаваны яе бацька. Архіў згарэў, слядоў пасля сябе не пакінуў, затое засталіся дзеці вайны без нікога і без нічога. Прабабуля расказвала, што ў дзіцячым доме яны выбіралі сабе «дзень нараджэння» — 8 сакавіка, 1 мая або 7 лістапада, а таксама дабаўлялі гады, каб хутчэй пайсці зарабляць сабе на хлеб. Усё гэта наступствы самага бесчалавечага выпрабавання, самага страшнага звера, імя якому — вайна...

**Аляксей ЗУБЕЛЬ,**
**вучань 8 «А» класа**
**СШ № 3 г. Вілейкі.**

## Звяздоўскі прыз — за ручнога мядзведзя

**По добрай традыцыі ў пачатку новага года рэдакцыйнае журы падводзіць вынікі конкурсаў. «Фотаздымак з гісторыяй» не выключэнне. Гэтым разам прыз ад «Звязды» дастанецца Наталлі ТОЛКАЧ з горада Ліды Гродзенскай вобласці. Яна даслала на конкурс незвычайны фотаздымак («Свойскі мядзведзь», «Звязда» ад 20.06.2017). На ім — на разгалістай бярозе сядзяць два мужчыны (дзядуля аўтаркі Міхась Шатроў ды яго брат) і... жывы мядзведзь.**



«Фота зроблена ў Томскай вобласці, у Сібіры, дзе і вырас дзядуля. Умовы ў тых краях былі суровыя: вёсачка, якой сёння ўжо няма на карце, размяшчалася пасярод тайгі. Аднойчы дзядуля з сям'ёй падабралі ў лесе медзведзяня. Паляўнічыя забілі мядзведзіцу, а яе дзіця засталося адно. Вырашылі ўзяць яго дадому. Адмысловая дыета, выхаванне — і мядзведзь быў практычна ручны. Ён быў ахоўнікам хаты — абараняў сям'ю ад дзікіх жывёл, якія маглі выйсці з лесу. У мядзведзя быў свой домік у двары — як вядома, цяжка параўнаць з сабачай будкай, але па сутнасці ідэя была падобная. Сям'я дзядулі — не адзіная, хто падбіраў медзведзянят, тады гэта была справа калі не звыклая, то не настолькі незвычайная, як сёння».

Пераможцу, каб атрымаць прыз, просім звязацца з рэдакцыяй па нумары 8 (017) 287 17 57. А тым, хто зараз чытае гэты матэрыял, прапануем дастаць з трэльяжа свой сямейны альбом і здзейсніць вандроўку ў мінулае. Бо конкурс «Фотаздымак з гісторыяй», які так палюбіўся чытачам, працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас лістоў. Цікавыя карткі (не больш за тры) з невялічкай (!) гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.

**P.S.** ***Калі ж вы даслалі свае фотаздымкі з гісторыяй летась, але не ўбачылі іх на старонках «Сямейнай газеты», не засмучайцеся. Падпісвайцеся на «Звязду» і шукайце іх у наступных нумарах. Тут мы не маем на ўвазе пашпартныя здымкі альбо вельмі «афіцыйныя» гісторыі да фота, якія нагадваюць больш выпіску з энцыклапедычнага даведніка, — на шчасце, такіх адзінкі. Зболышага пажоўклыя ад часу фотаздымкі вельмі цікавыя, а гісторыі — надзвычай кранальныя. Шчыра дзякуем вам за іх.***

Сямейная пошта

# «Сваё кіно» ў падарунак

У хаце Дарынкі нядаўна пасяліўся тэлевізар маркі «Нёман». Маленькі сам і з маленькім экранам ён прыехаў з Гомеля на цягніку. Аказалася, бацечку Дарынкі прэміравалі адзін раз, другі, і ён, прыхаваўшы тыя грошы, вырашыў прыпаднесці сям'і падарунак. Сюрпрыз удаўся, бо дома ніхто не чакаў такога вялікага «гасцінца». Пра яго першыя празналі Мацвей з Шуркам, бо ім прыйшлося дапамагаць бацьку несці запакаваныя ў кардон два пакункі. Ад хлопцаў пра «сваё кіно», там жа на станцыі, празналі «па сакрэце» іх дружбакі, а ад іх ужо іх дамашнія. Навіна аббегла ўсю вуліцу так хутка, што бацька не паспеў нават з дарогі памыць рукі і павячэраць.

Адзін за адным суседзі толькі мільгалі паўз вокны, што выходзілі на двор, і тут жа з'яўляліся ўжо на парозе кухні. Яны бягом рассаджваліся разам з дзецьмі, хто дзе, у той самай зале, у якой звычайна ладзіліся вячоркі. Малеча падала проста на падлогу, бліжэй да экрана, каб жа ўсё ўбачыць і нічога не прапусціць. У першы дзень збеглася ўся вуліца. Якая там зала? Кухня была бітком набіта старымі і малымі. Якая там вячэра? Прыйшлося «ўсё кідаць» і разам з хлопцамі ўстанаўліваць «тое кіно» — раскрываць запакаваны і перавязаны скураным рэменем, каб лаўчэй было несці ад станцыі, тэлевізар і пакунак меншы. Да тэлевізара ж яшчэ дадаваўся чорны чамаданчык-стабілізатар.

— Вой, гвалт! Ды з гэтым тэлевізарам! Няма куды ступіць! Нясі яго ў сваю кантору — там месца болей, дзецям жа ўрокі патрэбна вучыць, а дзе і як? А людзей жа не выганіш! — так маці, якой, і праўда, не было нават куды праціснуцца, каб штосьці ўбачыць у тым тэлевізары, зачыніўшы за апошнім чалавекам дзверы ў сенцы, пачала адчытваць бацьку дзесь апоўначы. Людзі не пакінулі хату, пакуль не закончыліся ўсе праграмы і не патух экран.

НАЗАЎТРА за сняданкам, калі ўся сям'я сабралася за сталом, бацька паставіў перад ёй пытанне рубам:

— Што будзем рабіць?

Усе разумелі пра што ідзе гаворка — пра тэлевізар. Дзеці, ад самай меншай Дарынкі да большага Сцяпана, трывожна пераглянуліся і ці не ў адзін голас заявілі: — Не!

— Не аддадзім бацькаў падарунак да канторы. Ён жа не ёй яго дарыў, а нам усім, — гэта па старшынстве ад імя ўсіх дзяцей заявіў старэйшы Сцяпан. — Мы будзем да яго прыстасоўвацца. Так, малеча? — глянуў ён на меншых братоў і сястру. Тыя ў адказ на такую прапанову Сцёпы згодна заківалі галовамі. Брат прадоўжыў: — Вучобу і ўсе дамашнія справы мы будзем рабіць да яго ўключэння.

— Як табе такая прапанова? А цяпер што ты скажаш на гэта? — вочы бацькі смяяліся. Па іх можна было здагадацца, што ён адабрае рашэнне дзяцей.



У адказ маці Дарынкі толькі паціснула плячыма: маўляў, пажывём-пабачым.

ТАК што бацька тэлевізар у «кантору» не панёс, а сям'і прыйшлося-такі «прыстасоўвацца» пад «падарунак». Цяпер Дарына разам з братамі павінна была да вячэрняга ўключэння тэлевізара парабіць урокі, дапамагчы маці па гаспадарцы, ды яшчэ і папрыбіраць да прыходу людзей усё ў хаце. Хлопцы таксама цяпер не марудзілі з урокамі пасля таго, як гуртам паспявалі перарабіць справы па гаспадарцы. Цяпер усе работы выконваліся не з-пад палкі, як казала на гэта іх маці, а з аглядкай на тэлевізійныя праграмы.

— Давайце бягом, бо не паспеем на кіно, — падганяе малодшых брата і сястру Мацвей. — Забылі? Сёння пачынаецца шматсерыйны фільм «Чатыры танкісты і сабака».

Мацвей, Шурка і Дарынка пачынаюць яшчэ шпарчэй грэбсці і збіраць апалае дубовае і бярозавае лісце, якое павінна пайсці на подсціл свінням, карове, цялушцы. Пакуль яно сухое, жоўтае ім патрэбна засыпаць увесь прысценак-засек пры свінушніку. Зімой гэты прысценак будзе яшчэ грэць і свіней. З мяшкамі, набітымі пад завязку, дзеці навыперадкі бягуць-паспяшаюць дахаты, у якой іх чакае бацькаў падарунак, што хавае ў сабе столькі ўсяго цікавага...

**Раіса ДЗЕЙКУН,**
*г. Гомель.*

## Галушкі на бедную куццю

— На бедную (посную) куццю мая бабуля заўсёды гатавала галушкі, — дзеліцца **Алена МАЧЭЛЬ**, якая родам з вёскі Сакалоўка (раней яна называлася Чарвякі) Вілейскага раёна. — Мы з сёстрамі іх вельмі любілі, таму варылася гэтая святочная страва ажно ў 10-літровым вядры. Рэцэпт немудрагелісты. У першую чаргу трэба зварыць мак. Чым яго больш, тым смачней. Потым сцэджвалі кіпень, а мак расцiралі, каб ажно беленькае малако з'явілася. Дадавалі цукар і працягвалі расціраць. Затым дадавалі крыху кіпеню. Паралельна ў печы пяклі самі галушкі. Цеста робіцца з вады ды мукі, без аніякіх дабавак. Затым дзеліцца на доўгія тоўсценькія палоскі і наразаецца на невялічкія кавалачкі. Калі галушкі падсохлі, залівалі іх макавай вадкасцю. Мама звычайна чакае, пакуль яны размякнуць. Мы ж з сёстрамі вельмі любім есці гэтае смакоцце адразу, пакуль галушкі цвердаватыя. Праўда, матуля так і не навучылася іх гатаваць, таму цяпер бабуліну традыцыю ў нашай вялікай сям'і (на вялікія святы ў бацькоўскай хаце збіраецца ажно 28 чалавек) падтрымліваю я.

# МАДЭЛЬ САФІЙКА І ЧАТЫРЫ АСІЛКІ



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Янка ЧАБАТАРЭВІЧ дзеліцца рэцэптам сваёй піцы ў выглядзе зоркі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Спачатку мы ўспомнілі калядныя традыцыі. Што цікава, трэцяя частка дзетак хоць раз у жыцці хадзіла калядаваць. Бачылі б вы, з якім захапленнем яны распавядалі, хто колькі цукерак накалядаваў!

Што ўсцешыла, вучні гімназіі пра нашу газету чулі не ўпершыню. Іх класны кіраўнік, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Алена Лявонцьеўна Мачэль, штосераду прыносіць «Звязду» на інфармацыйную гадзіну. Таму дзеці з ахвотай адгукнуліся на маю прапанову «пажурыць» удзельнікаў конкурсу «Беларусікі». Яны па чарзе падыходзілі да партаў, на якіх былі раскладзеныя пранумараваныя здымачкі (усяго 34), што выходзілі на старонках «Сямейнай газеты», ды ўважліва разглядалі іх. Пасля пісалі свой нумар-фаварыт на паперках ды апускалі ў саламяны капялюш. Лічыла тыя паперкі Алена Лявонцьеўна разам з казой. Больш за ўсё галасоў набраў нумар 15. Таму абяцаны прыз — настольную беларускамоўную гульню для ўсёй сям'і атрымлівае маленькая мадэль **Сафійка Троцкая са Жлобіна.** Нагадаем, што дзяўчынка любіць спяваць, танцаваць, маляваць, а таксама дапамагаць маці Святлане па доме. Акрамя таго, яна займаецца харэаграфіяй і наведвае мадэльную студыю.

Вынікі гэтага, як і любога падобнага конкурсу, дастаткова суб'ектыўныя. Асабіста мне падабаюцца ўсе ўдзельнікі без выключэння. Асобны дзякуй хочацца сказаць іх бацькам ды бабулям і дзядулям: за тое, што выхоўваеце сапраўдных беларускіх і расказваеце пра іх на старонках «Звязды». Магчыма, а я на гэта вельмі спадзяюся, вы сваім станоўчым прыкладам натхніце і іншых матуль і татаў.



Пераможца конкурсу «Беларусікі» — Сафійка ТРОЦКАЯ са Жлобіна.

На памяць пра нашу сустрэчу я падарыла гімназіі некалькі звяздоўскіх насценных календароў са здымкам (на якім фальклорны гурт «Калыханка») Анатоля Клешчука. Пасля гэтага да мяне падышла дзяўчынка Каця Шпілявая. Сказала, што яна... таксама спявае ў гурце «Калыханка», ужо 7 гадоў! І спытала, ці можа прыняць удзел у конкурсе «Беларусікі», маўляў, «у мяне таксама ёсць прыгожы нацыянальны строй». Таму, даражэнькія сябры, **конкурс працягваецца. Мы з нецярпеннем чакаем здымкаў Каці і вашых дзетак, унукаў, а можа нават і праўнукаў з невялічкім аповедам.**

## Як запомніць колеры вясёлкі

У гэты ж дзень мы падвялі вынікі конкурсу на найлепшую беларускамоўную падказку-запаміналку паслядоўнасці колераў вясёлкі. Пераможцу гэтым разам вызначала Алена Лявонцьеўна.

Перш чым падвесці вынікі конкурсу, я запыталася ў школьнікаў, ці ведаюць яны якую-небудзь («вясёлкавую») запаміналку). «Каждый Охотник Желает Знать, Где Сидит Фазан», — адказалі яны ў адзін голас. Гэтае выказванне па рускай мове, думаю, ведаюць усе з дзяцінства. А хочацца, каб быў нейкі свой, адметны адпаведнік.

Асабіста мне вельмі падабаецца запаміналка, якую даслала **Таццяна СТАНКЕВІЧ:** *«Чорцік Аднойчы Жалейку Знайшоў, Бадзёра Сабраўся Фукаць»* (першыя літары кожнага слова з'яўляюцца першымі літарамі назвы колеру: чырвоны — аранжавы — жоўты — зялёны — блакітны — сіні — фіялетавы). Праўда, яна не ўдзельнічала ў конкурсе, бо маладая мама шчыра прызналася, што «гэтая запаміналка прыдуманая не мною, але вядома мне з дзяцінства».

**Галіна Аляксандраўна НАЗАРАВА**, былая выкладчыца на пенсіі з Мінска, наогул здзівіла. Яна даслала ажно 67 каляровых падказак-запаміналак. Праўда, яны практычна ўсе «дарослыя». Таму з улікам таго, што запаміналка ўсё ж такі арыентавана на дзяцей, для ўдзелу ў конкурсе мы выбралі наступную: *«Чаравічкі Аднойчы Жораву Зрабіў Былы Сябар Філін»*.

Пакуль елі «зорную» піцу ды бліны-зорачкі, я запыталася ў дзяцей, які варыянт ім прыйшоўся даспадобы. 11 з іх выбралі запаміналку, якую прыдумаў **Вячаслаў Мікалаевіч САСНОЎСКІ,** пенсіянер з г. п. Смілавічы: *«Чалавеку Аптымістычна Жыць Замінаюць Боль, Спакуса, Фанабэрыя»*. Я, шчыра прызнацца, вельмі здзівілася, што дзеці выбралі такі дарослы філасофскі варыянт. Настаўніца выказала меркаванне, што ім, пэўна, спадабаліся незнаёмыя словы. Сапраўды, вучні адразу ж пачалі пытацца, што такое «фанабэрыя», «спакуса».

«Мне спадабалася выказванне пра чатырох асілкаў: яно з сэнсам і лёгка запамінаецца», — нарэшце агучвае свайго фаварыта Алена Лявонцьеўна.

Такім чынам, пераможцам конкурсу і шчаслівым уладальнікам экалагічнай цацкі — вясёлкі-баланcіра — стала **сям'я Балейкаў з Ваўкавыска.** Вось, дарэчы, ліст, які яны даслалі ў рэдакцыю амаль год таму:

«Дзякуй вялікі за такі сімпатычны і душэўны конкурс. Мы ўсёй сям'ёй цэлы вечар цудоўна бавілі час, прыдумляючы падказку. Атрымліваліся і вельмі смешныя, і філасофскія, і варыянты «для дарослых». Вось некаторыя з іх: Чарцяня Абавязкова Жадае Зла Благім Суседзям Фанабэрыстым / Часта Арол Жадае Знайсці Бесклапотную Сутнасць Фарэлі / Чаму Алень Жыве З Бабром Сябрамі Фантастычнымі? / Чарговы Аўторак Жадаю Зняць Белыя Святочныя Фіранкі / Чаравікі Абуўшы Жвава, Замест Бабулі Столь Фарбую / Чаму Айчынныя Жанчыны Заўсёды Бароняць Сваю Фігуру?



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Шчаслівым уладальнікам вясёлкі-балансіра стала сям'я БАЛЕЙКАЎ з Ваўкавыска.

Насмяяліся ад душы, а старэйшы сынок другакласнік Яраслаў яшчэ і папрактыкаваўся ў мове. Аднак напрыканцы вечара мы прыйшлі да высновы, па якіх параметрах варта выбіраць словы для падказкі. Перш за ўсё, трэба мець на ўвазе, што 99 % тых, каму гэткая падказка патрэбная, — дзеткі, таму словы павінны быць нескладаныя, кароткія, а сэнс выказвання зразумелы.Таму на конкурс мы вырашылі выставіць наступны варыянт: *«Чатыры Асілкі Жвава З'елі Бочку Сухой Фасолі»*. Падказка нам падаецца простай і небессэнсоўнай, ну і трохі смешнай, што дзеткам заўжды падабаецца. Вывучыў яе сынок імгненна. Спадзяёмся, вам таксама спадабаецца, а наш малодшанькі Андрэйка, якому няма і трох месяцаў, атрымае файны падаруначак».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

**Відэа глядзіце на сайце www.zviazda.by**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

### ВАРТА ВЕДАЦЬ

## ВЫДАЛЯЕМ СЛЯДЫ СВЯТОЧНЫХ ЗАСТОЛЛЯЎ

**Вядома, прыемна накрыць святочны стол беласнежным накрухмаленым абрусам. Але ўсе ведаюць, як цяжка потым зноў прыводзіць яго ў парадак, асабліва, калі не заняцца плямамі, пакуль яны свежыя. Ды і на адзенні часам таксама застаюцца «сляды свята».**

- Вырабы са штучных шаўковых тканін нельга адразу, без пробы, чысціць такімі сродкамі, як ацэтон, пераксіс вадароду, шчаўевая, воцатная і лімонная кіслоты.
- Вінныя плямы знікаюць, калі старанна прамыць іх у цёплым малацэ, пасля чаго прапаласкаць спачатку ў халоднай, а затым у гарачай вадзе.
- Плямы ад садавіны і фруктовых сокаў можна выдаліць растворам гліцэрыны і гарэлкі (у роўных частках), а таксама, калі трымаць тканіну над посудам з кіпячай вадой і праціраць пляму воцатам.
- Плямы ад фруктовага соку варта працерці нашатырным спіртам напалову з вадой, затым увесь выраб памыць.
- Вінныя плямы на сукенцы з баваўнянай тканіны можна вывесці кіпячоным малаком.
- Плямы ад губной памады на воўне і шоўку лёгка выводзяцца чыстым спіртам.
- Свежыя плямы ад чырвонага віна, садавіны трэба засыпаць соллю і прамываць вадой з мылам ці працерці 5-працэнтным растворам нашатырнага спірту, а затым прамыць.
- Плямы ад поту на ваўняным вырабе можна выдаліць анучкай, змочанай у моцным растворы солі. Можна таксама працерці іх спіртам.
- Плямы ад гарбаты выдаляюцца сумессю гліцэрыны з нашатырным спіртам (4 часткі гліцэрыны і 1 частка нашатырнага спірту). Старыя плямы на белай тканіне лепш выдаляць растворам шчаўевай кіслаты (1/2 чайнай лыжкі на шклянку вады) або растворам гіпасульфіту (1 чайная лыжка на 1/2 шклянкі вады). Затым рэч вычысціць, вымыць у мыльнай вадзе, дадаўшы на 1 л вады 2 чайныя лыжкі нашатырнага спірту, і добра прапаласкаць.
- Плямы ад кавы, какавы выдаляюцца нашатырным спіртам, напалову разведзеным вадой. Асабліва добры эфект дасягаецца, калі спачатку працерці пляму бензінам.
- Плямы ад кавы, какавы на тонкіх шаўковых сукенках можна вывесці, калі намачыць пляму падагрэтай гліцэрынай і пакінуць на 5—10 хвілін, затым прапаласкаць у цёплай кіпячонай вадзе.

### КУЛІНАРНЫЯ ВАНДРОЎКІ

## ПАЛЮШКІ

**Раней ва Украіне тварог перасыпалі соллю, утрамбоўвалі, апускалі ў склеп на захоўванне для выкарыстання зімой, у перыяд, калі карова не дае малака. А бульбу потым дадавалі, каб у спалучэнні з тварагом смак гатовай стравы быў менш салёны. І начынку для варэнікаў рабілі — салёны тварог і вараная бульба. Калі начынка заставалася, у яе падмешвалі муку і рабілі палюшкі.**



***Спатрэбіцца:*** *бульба (звараная ў мундзіры») — 500 г, тварог (чым тлусцейшы, тым лепш) — 200 г, мука — 7 ст. л., яйка — 1 шт., смятана (калі тварог нятлусты) — 1 ст. л., соль.*

Тварог праціраем праз сіта ці ўзбіваем блэндарам да аднастайнасці. У нятлусты дадаём лыжку смятаны, затым яйка ды соль (каб было дастаткова салёна) і змешваем. На сырнай тарцы надзіраем 500 г вараной «у мундзіры» і астылай бульбы. Змешваем бульбу з тварагом і паступова дадаём муку. Трэба быць гатовымі, што муку даводзецца насыпаць «на вока». Бывае, што і 5 ст. лыжак хопіць, а іншы раз давядзецца і 12 умешваць. Замешваем цеста так, каб яго можна было скочваць у каўбаскі. Яно павінна атрымацца злёгку сыраватае і ліпучае, але цалкам кіруемае.

Дзелім цеста на 4 часткі, і з кожнай скочваем каўбаску. Кожную каўбаску дзелім нажом на невялікія (прыкладна з грэцкі арэх) роўныя часткі. Атрымаеныя кавалачкі абвальваем у муцэ. Цяпер скручваем з цеста шарыкі і прыціскаем з аднаго боку відэльцам. Адварваюць палюшкі ў кіпячай падсоленай вадзе з дадаццем 1 ст. лыжкі алею. Вараць 2—3 хвіліны пасля ўсплывання.

Дастаём шумоўкай і падаём з маслам і смятанай. Вельмі смачна з кропам.

Яны спалучаюцца практычна з усім (з мясам, птушкай, агароднінымі соусамі, салодкімі соусамі). Можна падсмажыць дробнанарэзаную грудзінку з цыбуляй і паліць гэтай смажанінай палюшкі.

### БАБУЛІНЫ ДЭСЕРТЫ

## ПУДЫНГ З ЧЭРСТВАГА ХЛЕБА

***Спатрэбіцца:*** *2 яйкі, 0,5 шклянкі малака, 6—7 лустачак чэрствага белага батона ці сухароў, 2—3 яблыкі, 50 г масла, 5 ч. л. цукру.*



Яблыкі ачысціць ад скуркі і нарэзаць невялікімі кавалачкамі. Пры жаданні да іх можна дадаць разынкі, арэхі або свежыя ягады, а таксама карыцу. Яйкі ўзбіць відэльцам з 2 лыжкамі цукру. Дадаць малако. Дно і бакавыя сценкі формы шчодра змазаць маслам. Чэрствы хлеб абмакваць з абодвух бакоў у яечна-малочную сумесь. Калі бяруцца сухары, то для зручнасці іх можна буйна паламаць, пакласці ў міску з яечнай сумессю, змяшаць і пакінуць набрыняць на 2—3 хвіліны.

У форму пакласці ў адзін пласт трэцюю частку хлеба. На яго выкласці трэцюю частку яблыкаў. Пасыпаць 1 ч. лыжкай цукру і раскласці невялікія кавалачкі масла (таксама адну трэцюю частку ад агульнага аб'ёму). Калі масла замарожанае, то яго можна надзерці на тарцы.

Слаі паўтарыць тройчы. Апошнім павінен быць пласт яблыкаў, пасыпаны цукрам. Калі засталася яечная маса — выліць яе ў форму. (Каб пудынг не рассыпаўся, пажадана ўсе слаі трохі ўтрамбаваць — прыціснуць рукой.) Зверху раскласці кавалачкі масла. Выпякаць у разагрэтай да 200—220 градусаў духоўцы 30—35 хвілін.

*САМАЕ ВАЖНАЕ Ў ЛЮБЫХ АДНОСІНАХ — ЖАДАННЕ БЫЦЬ РАЗАМ (Фёдар Дастаеўскі).*

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

# Шляхамі Эдварда Вайніловіча


Ірына ШКУЦЬКА дэманструе фартушок бабулі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ірына Яўгенаўна паказвае здымак, якому больш за сто гадоў. На ім прабабуля Ганна, яе дачка Вольга, які тут 16 гадоў, і прадзед Пётр. Усе прыгожа апранутыя, па тагачаснай модзе.

— Сялян, якія сумленна працавалі, пан шанаваў, добра ім плаціў. Яны маглі купіць нават крамную вопратку, як казала бабуля. А яе сям'я была працавітая, таму і жыла заможна. — прцягвае Ірына Шкуцька. — Праўяраў якасць работ аканом або сам пан Эдвард. Аб'язджаў ён свае ўладанні на кані, запрэжаным у двухколавую брычку. Адзін малады мужчына, заўважыўшы гаспадара, пачаў падганяць каня, імітуючы, так бы мовіць, спрыт. Але той памераў кійком глыбіню разоры ды кажа яму: «За гэтую частку дня, што адпрацаваў, з табой разлічацца, але прыйдзеш араць тады, калі добра навучышся». Бабуля часта паўтарала, што ён патрабаваў добрай, якаснай работы, але ніколі нікога не пакараў за нейкую правіннасць. Аднойчы ехаў чалавек з вёскі Заракаўцы нападпітку з гасцей. Магчыма, на Вялікдзень, бо было гэта напрадвесні: толькі зазеляненлі азімыя. Як на той грэх, селянін заснуў, а конь і збочыў на поле. Дзе пашчыпаў, а дзе папатаў пасевы, ад воза засталіся глыбокія каляіны. Прыбег аканом з людзьмі, мужыка разам з канём даставілі ў панскі двор. Выйшаў гаспадар ды кажа: «Ведай, хлопча, што каня перад дарогай трэба пакарміць, каб не шукаў сабе ежу», і загадаў пакласці ў воз бярэмя сена, маўляў, прыедзеш дадому, дасі жывёліне, каб не рабіла шкоды. **Ніколі пан не пакідаў сялян сам-насам са сваёй бядой, турботамі. Здараліся эпідэміі хвароб, неўрадлівыя гады, а бывала, людзі ў шматдзетных сем'ях з'ядалі ўвесь ураджай да вясны і не было чым сеяць. Але яны ведалі, што пан дапаможа зернем.** Ні адна сірата, ні адзін чалавек не пайшлі жабраваць, ніхто не памёр з холаду і голаду, у знямозе і адзіноце. Каля цагельні Вайніловіч пабудаваў жаночыя і мужчынскія баракі з пячным ацяпленнем. Тут жылі тыя, хто страціў дах над галавой, бацькоў, старыя, нямоглыя. Іх кармілі, за малымі даглядалі старэйшыя.

— У кожнай вёсцы Вайніловіч адкрыў школы: у Пузаве (сучасная — Вясёлае), Савічах, Браткаве. У свой час Вольга Пятроўна мне паказвала, дзе яны стаялі. Навучальныя ўстановы ён фінансаваў, плаціў за кватэру настаўнікам і купляў падручнікі, — працягвае мая суразмоўніца. Яна паказала «Закон Божы», выдадзены ў 1887 годзе на стараславянскай мове. Па ім вучылася бабуля Вольга ў царкоўнапрыходскай школе. Ён займаў пачэснае месца ў кніжнай паліцы. Але, падчас савецкай улады, вокладку замянілі на вокладку ад падручніка «Роднае слова». Так бы мовіць, «замаскіравалі», бо непажаданы госць мог данесці куды трэба.

— Вайніловіч наведваў школы, цікавіўся, як хто вучыцца. Тым, хто паказваў добрыя вынікі, плаціў стыпендыю. У Вольгі Пятроўны быў старэйшы брат Феафан, якога хатнія звалі Феня. Хлопец закончыў царкоўнапрыходскую школу на «выдатна», і пан паслаў яго вучыцца ў Слуцкую гімназію, зняў яму за асабістыя грошы кватэру, плаціў за вучобу. Юнак і тут апраўдаў давер апекуна, і той накіраваў яго ў інстытут у Маскву. У сям'і меркавалі, што брат працаваў у канструктарскім бюро, тады пачыналі будаваць аэрапланы, і ён прымаў у гэтай справе непасрэдны ўдзел, паколькі вучыўся ў інстытуце з фізіка-матэматычным ухілам. Пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы яго пакінулі там выкладчыкам, — Ірына Шкуцька дэманструе фотаздымак свайго родзіча з кнігай у руках, які ён даслаў бацькам са сталіцы ў пачатку 30-х гадоў мінулага стагоддзя.

— А хто вось гэты малады вайсковец — статны, з выдатнай выпраўкай? — зацікавілася я адным з фота.

— Мой дзядуля Іван Місевіч, служыў на панскайканюшні, лячыў коней, ведаў літаральна ўсё пра іх хваробы, — канстатуе жанчына. — Іван Мікітавіч быў адукаваны чалавек, закончыў чатырохкласнае вучылішча. У 1914 годзе, калі пачалася Першая сусветная вайна, яго прызвалі ў царскую армію. Дзядуля — унтэр-афіцэр, быў памочнікам ветурача ў гвардзейскім кавалерыйскім палку. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся да прывычнай справы. Пасля ад'езду пана Эдварда ў Польшчу ён узяў на памяць дадому толькі конскую дугу. Яна была прыгожая, пафарбаваная ў зялёны колер, з чырвоным аздабленнем. Менавіта дзядуля надзяваў яе на каня, калі пан Эдвард кудысьці ехаў. Дуга захоўвалася ў хаце пад столлю. Але ў 1920-я гады, калі ўсталёўвалася савецка-польская мяжа, ён яе пасек і спаліў, бо зразумеў, што Вайніловіч ужо ніколі не вернецца ў свой маёнтак. Мясцовыя сяляне любілі і паважалі пана, які рабіў для іх толькі дабро. Ніхто з сялян не рабаваў яго маёмасць, як сцвярджае хтосьці сёння. Па ўспамінах бабулі, рабавала яго розная навалач: бежанцы, салдаты, марадзёры, паколькі маёнтак практычна знаходзіўся на лініі фронту. Забіралі коней, кароў, каштоўнасці. А фамільныя партрэты, што віселі ў палацы ў Савічах, пасеклі.


«Закон Божы» 1887 года выдання.

Пра адносіны да яго сялян піша ў кнізе «Успаміны» і сам Вайніловіч: «Другі раз мы вымушаны былі адыходзіць ад бальшавіцкага нашэсця. Але гэты ад'езд адрозніваўся ад папярэдняга 2 снежня 1918 года тым, што праходзіў ён адкрыта, аб ім ведалі ўвесь двор і мясцовае насельніцтва. І трэба сказаць, што выезд з Савіч, дарога цераз нашу вёску Браткава, Пузаўскі двор быў хутчэй за ўсё трыумфальнай працэсіяй, чым уцёкамі. Усе, хто сабраўся ў дворыку перад замкам, з плачам і бласлаўленнем развіталіся з намі. А ў вёсцы сяляне, што сабраліся каля хат, крычалі: «Няхай наш пан хутчэй вяртаецца!» Было гэта зусім зразумела, усе ведалі, што за намі прыйдуць сюды бальшавікі. А гэта пагражае


Вольга Пятроўна АКСЁННІК *(стаіць)* са сваёй маці.

наборамі ў армію, рэквізіцыяй, разбоямі і грабяжамі». Разам з тым ва «Успамінах» ён сведчыць, што, калі ехаў у Польшчу, то па дарозе бачыў, як жыхары суседняга мястэчка Цімкавічы, што належала Радзівілам, з яго лесу вязуць дубы. Але ён адвярнуўся, зрабіў выгляд, што не заўважыў, як яго рабуюць.

«20 лютага 1921 года на нашых фамільных магілах пашкоджаны помнікі, нават мёртвым няма спакою. Магчыма, няма сэнсу цешыць сябе надзеяй аб вяртанні дамоў вясной», — напісаў у сваёй кнізе Эдвард Вайніловіч.

— Мабыць, і дагэтуль у нас засталіся прывітыя Вайніловічам нашым продкам якасці. Людзі ў нас добрыя, сардэчныя, заўсёды прыйдуць на дапамогу, выручаць, — лічыць Ірына Яўгенаўна.

— У пару майго дзяцінства ў нас нават хаты на замок не закрывалі, усе давяралі адзін аднаму, — уступае ў размову загадчыца Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі, дачка Ірыны Шкуцькі — Вольга Радкевіч, якую назвалі ў гонар прабабулі. Дарэчы, у бібліятэцы дзейнічае выстава «Ён наш зямляк, ён наша слава», якая пастаянна папаўняецца новымі матэрыяламі.

Так сталася, што праўнучка жыве ў вёсцы Браткава, у той самай хаце, куды прыйшла замуж Вольга Пятроўна. Вядома, будынак змяніўся, яго абклалі цэглай, пашырылі, зрабілі прыбудоўкі. Але аснову — драўляныя зруб і столь, якія праслужаць яшчэ сто гадоў, — пакінулі. Так што Вольга Радкевіч жыве ў знакамітым доме, з якім звязана шмат гістарычных падзей. У тым ліку падчас Вялікай Айчыннай вайны тут збіраліся і народныя мсціўцы, Вольга Пятроўна пякла начамі хлеб партызанам, дапамагала адзеннем, мыла бялізну. У партызанах былі і яе сыны Іван і Сямён.

У сялян Эдварда Вайніловіча былі не толькі суцэльныя будні. На Тройцу, Вялікдзень, свята Пятра і Паўла ды іншыя пасля богаслужэння ў царкве, дзе прысутнічаў і пан, усім дазвалялася ісці ў парк, што быў разбіты каля палаца. Тут гаспадар выстаўляў сталы з рознымі пачастункамі: мёдам, яблыкамі, печывам. «Бабуля добра памятала, што тут ігралі яўрэйскія музыкі з Цімкавіч: біў бубен, гралі скрыпкі, дзяўчаты і кавалеры танцавалі. Вайніловіч не аддзяляў сябе ад сялян, не пагарджаў імі, казаў: «Калі будуць моцныя сем'і, то будуць і добрыя працаўнікі». Жыхары яго вёсак былі спакойныя за сваю будучыню і будучыню сваіх дзяцей. На жаль, Бог не ўратаваў яго сына Сымона і дачку Алену. Вайніловіч ушанаваў памяць сваіх дзяцей, пабудаваўшы Чырвоны касцёл. Гэтая святыня напамінае і аб нашых продках, якія жылі і працавалі побач.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Уладзімір Высоцкі: БЕЛАРУСКІЯ КАРАНІ



СЁННЯ спаўняецца 80 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Высоцкага — паэта, акцёра, барда савецкай эпохі. Эпохі, якая больш за чвэрць стагоддзя таму канула ў Лету. А імя Высоцкага засталося на небасхіле нашай культуры, нібы яркая зорка, чыё святло ніколі не згасне.

Паводле вынікаў апытання Усерасійскага цэнтра грамадскай думкі, якое праводзілася некалькі гадоў таму, у спісе куміраў XX стагоддзя Уладзімір Высоцкі заняў 2-е месца пасля Юрыя Гагарына. Аўтар больш чым 700 песень на ўласныя вершы, акцёр тэатра і кіно, Высоцкі ў сваіх творах закранаў тэмы, забароненыя тагачаснай цэнзурай, спяваў пра паўсядзённае жыццё вельмі пранікнёна, шчыра, з вялікім душэўным надрывам. Асабліва гэта праявілася ў песнях Высоцкага пра Вялікую Айчынную вайну, якую ён ведаў па аповедах бацькі Сямёна Уладзіміравіча (1915—1997), палкоўніка, ваеннага сувязіста, кавалера больш чым 20 ордэнаў і медалёў, і па расказах свайго роднага дзядзькі Аляксея Уладзіміравіча (1919—1977), таксама палкоўніка, артылерыста, кавалера трох ордэнаў Чырвонага Сцяга.

Даследчыкі сцвярджаюць, што род Высоцкіх паходзіць з мястэчка Сялец Пружанскага павета Гродзенскай губерні (цяпер гэта Брэсцкая вобласць). А прозвішча Высоцкі можа быць звязана з назвай горада Высокае Камянецкага раёна той жа вобласці. Тым больш што дзед Высоцкага (дарэчы, таксама Уладзімір Сямёнавіч) нарадзіўся ў 1889 годзе ў Брэсце (тады Брэст-Літоўск) у сям'і выкладчыка рускай мовы. Пазней ён пераехаў у Кіеў. Меў тры вышэйшыя адукацыі — эканамічную, юрыдычную і хімічную. Бабуля Высоцкага Дар'я Аляксееўна (1891—1970) была медсястрой. Яна вельмі любіла свайго ўнука Валодзю і з'яўлялася шчырай прыхільніцай яго таленту.

Нягледзячы на тое, што У. Высоцкі нарадзіўся ў Маскве, ён ведаў пра свае беларускія карані і часта бываў у Беларусі. Напрыклад, у жніўні 1969 года падчас здымак фільма «Сыны ідуць у бой» (рэжысёр Віктар Тураў) Уладзімір Высоцкі і яго жонка Марына Влады нейкі час жылі ў вёсцы Літоўка пад Навагрудкам. Дарэчы, у гэтым горадзе ўсталяваны помнік Уладзіміру Сямёнавічу.

Песня «Брацкія магілы» стала вядомай пасля выхаду на экраны фільма Віктара Турава «Я родам з дзяцінства» (1966). Песня «Ён не прыйшоў з поля бою» была напісана ў 1969 годзе для фільма Віктара Турава «Сыны ідуць у бой».

**Дзмітрый ПЯТРОВІЧ.**

## ЁН НЕ ПРЫЙШОЎ З ПОЛЯ БОЮ

*Дык чаму ўсё не так?*
*Не забрала ж бяда?*
*Бачыш неба — блакітна-жывое,*
*Той жа лес, і паветра, і нават вада...*
*Толькі ён не прыйшоў з поля бою.*

*Не ўцяміць цяпер, хто меў рацыю з нас*
*У размовах без сну і спакою.*
*«Не хапае цябе», — зразумеў я ураз,*
*Калі ён не прыйшоў з поля бою.*

*Неўпапад ён маўчаў і не ў такт падпяваў*
*І заўжды гаварыў не пра тое,*
*Ён мне спаць не даваў*
*і да сонца ўставаў,—*
*А пасля не прыйшоў з поля бою.*

*Пуста ў сэрцы, хоць бачу я неба шацёр.*
*Зразумеў раптам: нас было двое...*
*Для мяне — быццам ветрам*
*задзьмула касцёр,*
*Калі ён не прыйшоў з поля бою.*

*Зноў вясна. Капяжы, як калісьці, звіняць.*
*Выпадкова паклікаў яго я:*
*«Дружа, дай закурыць!» —*
*а ў адказ цішыня...*
*Не вярнуўся учора ён з бою.*

*Не пакінуць ніколі яны у бядзе,*
*Нашы паўшыя — як вартавыя.*
*Неба ў лесе люструецца, нібы ў вадзе,*
*Ды і дрэвы — блакітна-жывыя.*

*Нам з ім месца ў зямлянцы*
*хапала ўпаўне,*
*Сябравалі часінай любою...*
*Ўсё цяпер — аднаму,—*
*толькі мроіцца мне —*
*Гэта я не прыйшоў з поля бою.*

15.09.2016 г.

## БРАЦКІЯ МАГІЛЫ

*На брацкіх магілах*
*не ставяць крыжоў,*
*І ўдовы на іх не галосяць.*
*Сюды ўсе прыходзяць*
*з адкрытай душой*
*І кветак букеты прыносяць.*

*Калісь тут ад болю крычала зямля.*
*А зараз – гранітныя пліты.*
*Хто скажа: «У кожнага —*
*доля свая...»?*
*Ўсе долі ў адзіную зліты.*

*А ў Вечным агні бачу ўспыхнуўшы танк,*
*У полымі рускія хаты,*
*Палаюць Смаленск, і нямецкі рэйхстаг,*
*І сэрца героя-салдата.*

*Ля брацкіх магіл не пабачыш удоў –*
*Мацнейшыя ходзяць тут людзі...*
*На брацкіх магілах не ставяць крыжоў.*
*Ды з гэтага лепей ці будзе?!*

**Пераклад з рускай мовы Дзмітрыя ПЯТРОВІЧА.**

02.01.2018 г.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о снятии объекта с торгов

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) сообщает о снятии с аукциона, назначенного на **12.02.2018, лота № 2 (здание магазина,** общей площадью **119,5 кв. м,** инв. **№ 623/С-58691,** расположенное на земельном участке с кадастровым номером **625650100005000300** площадью **0,1308 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: **Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. Колхозная, 53**).

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.01.2018 г.

## Информационное извещение о проведении 7 февраля 2018 года повторного аукциона по продаже права заключения договоров аренды площадей находящейся в собственности ОАО «Кристалл-маг» г. Барановичи

| | | |
|---|---|---|
| 1. Наименование объекта, его местонахождение | Часть многофункционального изолированного помещения с инвентарным номером 110/D -2774659 г. Барановичи, ул. Красноармейская,18-1 | |
| 2. Арендуемая площадь, м² | 19,8 | 17,9 |
| 3. Характеристика объекта | Изолированное служебное помещение на 1-м этаже одноэтажного многофункционального изолированного помещения. Имеется: центральное отопление, водоснабжение, электроосвещение, телефонизировано | Изолированное служебное помещение, состоящее из кабинета 12 кв. м и кладовой 5,9 кв. м на 1-м этаже одноэтажного многофункционального изолированного помещения. Имеется: центральное отопление, водоснабжение, электроосвещение, телефонизировано |
| 4. Начальная цена продажи права заключения договора аренды, базовых арендных величин | 4,95 | 4,475 |
| 5. Сумма задатка, базовых арендных величин | 0,495 | 0,4475 |
| 6. Условия аукциона | 1. Организация деятельности в соответствии с санитарными нормами и противопожарными требованиями.<br>2. Выполнение арендатором за счет собственных средств текущего ремонта арендуемых площадей | |
| 7. Срок аренды помещения | 3 года | |
| 8. Коэффициент к базовой ставке арендной платы в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду и (или) от использования арендуемого имущества | 1,5 | |
| 9. Размер уплачиваемого штрафа, базовых величин | 100 | |
| 10. Арендодатель объекта, его местонахождение | ОАО «Кристалл-маг» г. Барановичи, ул. Красноармейская,18-1 тел. 41-00-85 | |
| 11. Организатор аукциона | ОАО «Кристалл-маг» | |

1. Аукцион состоится 7 февраля 2018 года в 14 00 по адресу: г. Барановичи ул. Красноармейская,18-1.
2. Для участия в аукционе необходимо:
а) представить организатору аукциона заверенную банком копию платежного поручения либо иного документа о перечислении суммы задатка на расчетный счет: ОАО «Кристалл-маг», BY77BPSB30121226130149330000 БИК BPSBBY2X в ЦБУ № 101 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, УНП 200168503. Срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе; задаток перечисляется в белорусских рублях в зависимости от размера базовой арендной величины, установленной на день оплаты.
б) подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе установленной формы с приложением следующих документов:
юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь - копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;
юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь - легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;
индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя и документ, удостоверяющий личность; физическим лицом – документ удостоверяющий личность.
При подаче документов на участие в аукционе представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.
в) заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
После регистрации организатором аукциона заявления со всеми необходимыми документами лицо, желающее принять участие в аукционе, считается допущенным к участию и получает билет участника аукциона.
3. Лицо, допущенное к участию в аукционе, до начала аукциона имеет право отказаться от участия в нем. Отказом признается как письменное заявление, так и неявка на аукцион.
4. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Шаг аукциона устанавливается комиссией по проведению аукционов от 5 % до 15 %. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене.
Лицом, приравненным к победителю аукциона, считается единственный участник аукциона, давший согласие на покупку предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 15 %.
5. Спорные вопросы, возникающие в ходе проведения аукциона решаются комиссией.
6. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю) обязан:
– в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить: на расчетный счет ОАО «Кристалл-маг» (арендодателя) сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной суммы задатка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона.
Оплата предмета аукциона осуществляется в белорусских рублях в зависимости от размера базовой арендной величины, установленной на день оплаты;
– в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола заключить договор аренды с арендодателем.
В случае невыполнения одного из условий результаты аукциона аннулируются, внесенный задаток победителю аукциона (лицу, приравненному к победителю) не возвращается.
7. Цена продажи предмета аукциона не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством.
8. Организатор аукциона вправе в любое время отказаться от проведения аукциона, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения, уведомив об этом лиц, подавших заявление на участие в нем.
9. Задаток возвращается участникам аукциона, не выигравшим торги, лицам, отказавшимся от участия в аукционе, в течение 5 рабочих дней со дня подачи письменного заявления.
10. Штраф уплачивается участниками аукциона и (или) его победителями (приравненными к нему лицами) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением.
11. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 225409, г. Барановичи, ул. Красноармейская, д.18–1, с 8.00 до 12.00 и с 13.00 до 17.00 в рабочие дни по 6 февраля 2018 г. включительно. Контактный телефон в г. Барановичи, тел. (0163) 41-00-85.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

**Продавец:** транспортное республиканское унитарное предприятие «Витебское отделение Белорусской железной дороги» (Витебская дистанция гражданских сооружений), г. Витебск, ул. Космонавтов, 10, тел. (0212) 37-81-85

Лот № 1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года нежилых помещений площадью 222,0 кв. м, расположенных на 1-м этаже капитального строения (административное здание (хозяйственный блок СПК) с инв. № 200/С-54277 по адресу: г. Витебск, ул. Карла Маркса, 4 для размещения станции технического обслуживания и диагностики автомобилей, офисные помещения). Ежемесячный размер арендной платы – 26,64 базовых арендных величин. **Начальная цена**: 843,60 руб. **Задаток**: 84,36 руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 26.02.2018 в 10.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и подачи документов:** с 25.01.2018 с 8.30 по 23.02.2018 до 17.30

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договора аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08 2009 № 1049. Юридические, физические лица, индивидуальные предприниматели обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, представить: копию платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос. регистрацию юр. лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос. регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. **Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

### Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | ОАО «СМТ № 41», Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Гагарина, д. 24 |

**Предмет аукциона**

**Месторасположение: Гродненская область, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, д.19, 19/3, 19/6, 19/7, 23, 19/10**

| Наименование | Назначение | Инвентарный номер | Общая площадь |
|---|---|---|---|
| **Административно-бытовой корпус ЖБИ** | Здание административно-хозяйственное | 443/С-21218 | 1244,6 |
| **Арматурный цех (без оборудования)** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 443/С-13727 | 3187 |
| **БСЦ ЖБИ** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 443/С-21219 | 729,3 |
| Составные части и принадлежности | Галерея (а) | | |
| **Полигон** | Сооружение неустановленного назначения | 443/С-21204 | 562 |
| Составные части и принадлежности | Железобетонные пропарочные камеры (а, б, в) | | |
| **Склад готовой продукции (без оборудования)** | Сооружение специализированное складов, хранилищ | 443/С-21205 | 2565,5 |
| **Склад металла** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 443/С-21206 | 1195,9 |
| **Формовочный цех (без оборудования)** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 443/С-13718 | 2418,9 |
| Составные части и принадлежности | Очистные сооружения (а) | | |
| **Административно-бытовой корпус ЗТБ** | Здание административно-хозяйственное | 443/С-13715 | 793 |
| Составные части и принадлежности | Подвал (А3/к), забор, ворота, кирпичная уборная (1) | | |
| **Автодороги** | Сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства | 443/С-21202 | 15812 |
| Составные части и принадлежности | Дорожное полотно (а1, а2, а3, а4, а5, а6, а7, а8, а9) | | |
| **Бетоносмесильный цех (без оборудования)** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 443/С-13713 | 792,3 |
| Составные части и принадлежности | Галерея (а) | | |
| **Открытый склад заполнителей** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 443/С-13719 | 276,5 |
| **Проходная** | Здание нежилое | 443/С-13742 | 17,9 |
| **Склад цемента (без оборудования)** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 443/С-13735 | 497,2 |
| Составные части и принадлежности | Подвал (А1-2/к), рампа | | |
| **Комплексная трансформаторная подстанция (без оборудования)** | Здание специализированное энергетики | 443/С-21203 | 73,1 |
| **Компрессорная (без оборудования)** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 443/С-13733 | 312,4 |
| Составные части и принадлежности | Подвал (А1/кп) | | |
| **Закрытый склад заполнителей** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 443/С-13734 | 325,5 |

**Сведения о земельном участке:** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений завода железобетонных изделий площадью 10,6793 га с установленными ограничениями (обременениями) в отношении недвижимого имущества, находящегося в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь 0,1368 га

**Начальная цена с НДС 20 % – 1 179 150,00 бел. руб.**

| | |
|---|---|
| **Обременения** | **Договор аренды на арматурный цех, АБК ЗТБ** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | 2 рабочих дня после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **5 (пяти) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 11.01.2017 г.**

**Аукцион состоится 07.02.2018 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 05.02.2018 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by. Email: auction@cpo.by

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Автомобиль фургон «Купава» МАЗ-437043, 2008 г. в., гос. № АВ0500-4 |
| Начальная цена продажи | 13 651,20 руб. (тринадцать тысяч шестьсот пятьдесят один рубль двадцать копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 1 365 руб. (одна тысяча триста шестьдесят пять рублей) |
| **ЛОТ 2** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Автомашина ГАЗ-331043, 2007 г. в., гос. № АА2823-4 |
| Начальная цена продажи | 4 987,20 руб. (четыре тысячи девятьсот восемьдесят семь рублей двадцать копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 500 руб. (пятьсот рублей) |
| **ЛОТ 3** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Полуприцеп-цистерна ППЦ-30, модели 9635, 2008 г. в., гос. № А3001А-4 |
| Начальная цена продажи | 27 727,20 руб. (двадцать семь тысяч семьсот двадцать семь рублей двадцать копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 2 773 руб. (две тысячи семьсот семьдесят три рубля) |
| **ЛОТ 4** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Полуприцеп-цистерна 9635 ППЦ-30-BPW-4Y-01 с ABS, гос. № А1625А-4 |
| Начальная цена продажи | 24 439,20 руб. (двадцать четыре тысячи четыреста тридцать девять рублей двадцать копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 2 444 руб. (две тысячи четыреста сорок четыре рубля) |
| **ЛОТ 5** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Прицеп-цистерна ПЦ-8/1, МАЗ 892600-(1020-001Р), 2012 г. в., гос. № А6559А-4 |
| Начальная цена продажи | 24 187,20 руб. (двадцать четыре тысячи сто восемьдесят семь рублей двадцать копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 2 418 руб. (две тысячи четыреста восемнадцать рублей) |
| **ЛОТ 6** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Прицеп-цистерна ПЦ-8, 2009 г. в., гос. № 3483АА-4 |
| Начальная цена продажи | 17 851,20 руб. (семнадцать тысяч восемьсот пятьдесят один рубль двадцать копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 1 785 руб. (одна тысяча семьсот восемьдесят пять рублей) |
| Условия аукциона | Без условий |
| Продавец | ОАО «Лиданефтепродукт», 231300, г. Лида, пр-т Победы, 127, тел. 8 0154 550-808 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия оплаты | 100 % предоплата за приобретаемый объект |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 27 февраля 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатор аукциона извещает участников аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 21 февраля 2018 г. до 15.00**

*Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*

■ Памяць

# КАБ НІКОЛІ НЕ ЗГАСЛА СОНЦА

## Прыйдзе вясна, заквітнее сад, але дзеці, якіх забрала вайна, ніколі гэтага не ўбачаць...

**У суботу мы будзем успамінаць ахвяр халакосту. Але гэты дзень аб'ядноўвае ў сабе памяць не толькі аб яўрэях, знішчаных гітлераўцамі падчас Другой сусветнай вайны. 27 студзеня 1945 года былі вызвалены вязні аднаго з найстрашнейшых лагераў смерці Асвенціма. Лагера, дзе разам з дарослымі ўтрымліваліся і дзеці. Ніхто не ведае, колькі хлопчыкаў і дзяўчынак забрала тая вайна. Толькі па прыкладных падліках размова ідзе пра мільёны.**

Нічога не можа быць больш жудасным, чым дзіцячыя фабрыкі смерці. Калі будзеце ў Гомелі, не паляніцеся праехаць некалькі дзясяткаў кіламетраў у бок аграгарадка Красны Бераг. Акрамя сядзібы XIX стагоддзя, там знаходзіцца адзіны ў краіне мемарыял, прысвечаны дзецям, якія загінулі падчас вайны. Месца, дзе фізічна адчуваецца ўвесь той усёпаглынальны боль. Гэта цяжка, але там абавязкова трэба пабываць. Каб скурай адчуць, што такое вайна і нацызм.

Зімой тут асабліва тужліва. Вялікая тэрыторыя з сімвалічнай Плошчай сонца, белымі партамі і адзінокай хударлявай дзяўчынкай, якая звяла над галавой тонкія, заламаныя ад адчаю рукі, быццам спрабуе абараніцца ад той нябачнай крыважэрнай пачвары, што навісла над ёй. Пад снегам не бачна, што пад яе нагамі чырвоныя каменьчыкі, якія сімвалізуюць кроў, — нелюдзі бралі яе ў дзяцей для салдат вермахта. Гэтай крыві так многа, што дзяўчынка ўстала на кончыкі пальцаў, каб не ступіць у яе. У дзіцячай постаці столькі болю і адчаю, што мароз прабягае па скуры ад немагчымасці нешта змяніць. Гэта дзяўчынка — сімвал усіх тых дзяцей, што трапілі ў жорны вайны. Скульптура называецца «Апаленае дзяцінства».

Мемарыял дзейнічае толькі з 2007 года, хоць думкі стварыць такі былі і раней. Кажуць, яшчэ Пётр Машэраў уздымаў гэта пытанне, але прайшло шмат часу, пакуль задумка ажыццявілася. Яе ўвасобіў у жыццё Леанід Левін, заслужаны архітэктар Беларусі, лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій, аўтар і суаўтар такіх вядомых мемарыялаў, як «Хатынь», «Яма» ў Мінску, «Салдацкае поле» ў Сталінградзе і шматлікіх іншых. Яму, дзіцяці вайны, не трэба было ўваходзіць у вобраз, імітаваць пачуцці. Ён іх перажыў сам і запомніў на ўсё астатняе жыццё. У Красным Беразе ён стварыў мемарыял, дзе няма гвалту, няма гармат, танкаў, самалётаў, але ёсць школьныя парты, дзіцячыя малюнкі, прыгожы караблік... І гэта кранае да слёз. Увесь комплекс — адначасова праклён вайне і гімн міру.

**Марыя ТКАЧОВА, старшы навуковы супрацоўнік, загадчыца філіяла «Красны Бераг» Жлобінскага краязнаўчага музея,** трагічную гісторыю не расказвае — перажывае. І ўбачанае ад гэтага ўспрымаецца яшчэ больш востра.

— 260 канцлагераў і іх аддзяленняў было ў Беларусі, Красны Бераг у тым ліку, — кажа яна. — На тэрыторыю былой вучэбнай гаспадаркі, якая знаходзілася ў сядзібе XIX стагоддзя — за кіламетр ад мемарыяла, прывозілі падлеткаў са Жлобінскага і суседніх раёнаў. Тут быў створаны зборны пункт для дзяцей славянскіх нацыянальнасцяў ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў. Нямеччына ўрачы лічылі, што менавіта іх кроў лепш прыжываецца ў арганізме параненых салдат вермахта. Дзяцей мылі ў рацэ або лазні, праводзілі медыцынскі агляд, пасля вешалі на кожнага фанерную таблічку з прозвішчам, імем, групай крыві і рэзус-фактарам. Потым хлопчыкаў і дзяўчынак накіроўвалі або ў Скобраўку Пухавіцкага раёна, дзе быў вялікі дзіцячы канцлагер, або ў Германію.

1990 дзяцей прайшлі праз лагер «Красны Бераг» і больш не вярнуліся дамоў. Цікавая акалічнасць. Сярод тых, хто трапіў у гэтую страшную машыну смерці, было толькі 15 ураджэнцаў Краснабярэжскага сельсавета. Іх магло быць нашмат болей, калі б не падпольная дзейнасць Віктара Васільчыка — бургамістра Краснага Берага падчас вайны. «Ён трымаў цесную сувязь з падпольшчыкамі, партызанамі, па абавязку сваёй службы ведаў, калі будзе аблава, абыходзіў дамы і папярэджваў бацькоў. Усіх, на жаль, зберагчы не змог», — расказвае экскурсавод малавядомыя факты з жыцця патрыёта.

Найлепшая пара чалавечага жыцця — дзяцінства. У ім шмат сонца, кветак, цяпла. Сонейка мемарыяла — самае сумнае на свеце. Бо сярод яго прамянёў ёсць шэра-чорны, ён цягнецца на захад, быццам падказвае той напрамак, адкуль прыйшла бяда. На ім размясціліся 21 парта бялюткага, як снег, колеру — сімвала чысціні і бязвіннасці. Да вайны наогул класы былі вельмі вялікія — па 40 і болей вучняў. Але гэты клас — мёртвы, пад партамі патокі дзіцячай крыві...

Дарэчы, ліст ад адной такой маленькай рабыні — 15-гадовай Каці Сусанінай можна ўбачыць на дошцы мемарыяльнага класа. Ён напісаны белымі літарамі, быццам бы крэйдай на цёмнай паверхні. «Дарагі добры татачка! Пішу я табе ліст з нямецкай катаргі. Калі ты, татачка, будзеш чытаць гэты ліст, мяне ў жывых не будзе. І мая просьба да цябе, бацька, пакарай нямецкіх крывапіўцаў. Гэта завяшчанне тваёй паміраючай дачкі...»

Адкуль гэты ліст?

— Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў горадзе Лёзне Віцебскай вобласці пайшоў на злом адзін з дамоў, — расказвае Марыя Ткачова. — Калі яго разбіралі, за цаглінай пячнога коміна знайшлі старонку са сшытка. Гэта быў ліст 15-гадовай дзяўчынкі Каці, якая пісала яго на фронт бацьку ў дзень свайго нараджэння... Калі ствараўся мемарыял, Леанід Левін паказаў гэты ліст сябру — Васілю Быкаву. Пісьменнік пачытаў яго і сказаў, што ніводны чалавек не возьмецца паправіць у ім ніводнай літары. Што датычыцца бацькі Каці, то той так і не пачытаў гэта пасланне. Ён загінуў летам 1944-га пры вызваленні Беларусі...



Дзяўчынка як сімвал дзяцей, якія загінулі падчас вайны.

Смерць — страшная гора, але жыццё ўсё роўна мацнейшае. Жыццесцвярджальныя вітражы з малюнкамі дзяцей, якія перажылі вайну, — сведчанне гэтаму. Вядомы мастак Сяргей Пятровіч Каткоў захаваў іх для гісторыі. Калі ствараўся мемарыял, Леанід Левін сустрэў дачку Сяргея Каткова — Святлану. Менавіта яна перадала малюнкі пасляваенных дзяцей, якія знайшла пасля смерці бацькі ў яго архіве. І тады ўзнікла ідэя іх павялічыць і ў якасці вітражоў паставіць на Плошчы сонца.

— На вітражах — цырк, прынцэса, горад будучага, Афрыка — вайны тут наогул няма, — кажа Марыя Ткачова. — Мы, супрацоўнікі мемарыяла, з лёгкай рукі Леаніда Левіна называем іх вокнамі шчаслівага дзяцінства. А перад імі — караблік надзеі. Ну хто з нас па вясне не адпраўляў караблік у плаванне са сваімі марамі і надзеямі? У загінулых падчас вайны дзяцей такой магчымасці не будзе. Таму на ветразях карабліка 171 імя дзяцей славянскай, цыганскай і яўрэйскай нацыянальнасцяў — менавіта іх болей за ўсё загінула падчас вайны. Імёны напісаны так, як звычайна дзіця кліча маці — Насця, Міця, Рома. Ужо стала традыцыяй, калі маладыя на ветразях карабліка выбіраюць імя для свайго будучага дзіцяці...

***P.S.*** *Летась, 22 чэрвеня, на тэрыторыі мемарыяла ў Красным Беразе была ўзятая зямля для крыпты храма ў гонар Усіх Святых у Мінску. Пры гэтым за душы загінулых дзяцей маліліся прадстаўнікі ўсіх канфесій нашай краіны...*

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*Гомельская вобласць*

■ На экранах

# КАЗКА ПРА НЕПРЫГАЖУНЮ І БОГА

**У пошуках добрага ці нават надзвычайнага кіно, яшчэ і з хэпі-эндам, у кінатэатры зараз можна трапіць на дзіўную гісторыю кахання — у фільме Гільерма дэль Тора «Форма вады». Тым самым фільме, што атрымаў Залатога льва Венецыянскага кінафестывалю, а цяпер прэтэндуе на Оскар, прычым у трынаццаці намінацыях.**

Карціна можа атрымаць статуэтку Амерыканскай кінаакадэміі як найлепшы фільм, за найлепшыя рэжысуру, сцэнарый, аператарскую работу, мантаж, дэкарацыі, касцюмы, некалькі акцёрскіх роляў... Цяпер у фільмаграфіі рэжысёра «Форма вады» можа паспаборнічаць нават са знакамітай карцінай «Лабірынт Фаўна», уключанай, між іншым, у спіс найлепшых фільмаў XXI стагоддзя па версіі BBC.

«Форму вады» чамусьці часта называюць гісторыяй пра прыгажуню і пачвару, хоць сітуацыя выглядае дыяметральна іншай: у цэнтры ўвагі нямая прыбіральшчыца ў навуковай лабараторыі Элайза і цудоўная «істота», чалавек-амфібія, якога ў пэўныя часы на пэўных тэрыторыях прызнавалі за бажаство, а цяпер схапілі і прывезлі ў лабараторыю для даследаванняў. Карацей, фільм распавядае пра каханне паміж непрыгажуняй і, лічы, Богам, а гэта ўжо зусім іншая гісторыя. Дзеля таго, каб убачыць «істоту», якую, дарэчы, аўтары ствралі па працягу дзевяці месяцаў, ужо варта ісці ў кінатэатр.

Дзеянне фільма адбываецца ў 1963 годзе: халодная вайна, спаборніцтва СССР і ЗША за дасягненні ў космасе, камуністы, шпіёны, жорсткасць амерыканскай вярхушкі ў жаданні дагнаць і перагнаць сапернікаў, тайная лабараторыя... Але ўсё пачынаецца з любоўна паказанага наладжанага распарадку дня Элайзы: нямая жанчына выключае будзільнік, ставіць варыцца яйкі, ідзе ў ванны пакой, рыхтуе ланч, чысціць туфлі, заходзіць да свайго суседа-мастака, едзе на аўтобусе на работу, спазняецца, сустракае сяброўку, слухае яе балбатню, мые падлогу. Калі першы раз мы зачараваны сочым за яе рухамі, прыйдзецца зразумець, што гэты шчаслівы спакой Элайзы — тое ж самае, што руціна, бо кожны яе дзень аднолькавы.

Праўда, гэты спакой парушаецца праз цікаўнасць і смеласць галоўнай гераіні: у лабараторыі хваляюцца ў чаканні новага экспаната, самага каштоўнага і незвычайнага за ўсю іх доўгую работу. Нехта вылавіў чалавека-амфібію,



які прыбывае сюды ў спецыяльным рэзервуары ў суправаджэнні суровага, бесчалавечнага Рычарда Стрыклэнда, што хоча скончыць сваю справу з «істотай» і атрымаць за яе асабістыя дывідэнды. Скончыць справу ў гэтым выпадку значыць у выніку забіць і аддаць на даследаванні.

І візуальна, і па сэнсе ад «Формы вады» складана адарвацца. Гільерма дэль Тора па-майстэрску, у неабходнай дазіроўцы выкарыстоўвае рэчаіснасць, каб на ёй пабудаваць усё ж асобны свет і асобную атмасферу. Карычневыя 1960-я, у прыцемках і сонечным святле праз пыльнае шкло, халодныя сцэны лабараторыі, насычаны антураж кватэр, цьмяна-шэры люксавы аўтамабіль, дождж і закінутыя пабудовы як месца сустрэчы. Ва ўсім гэтым дзейнічаюць яго персанажы: хоць і знаходзяцца ў пэўным палітычным кантэксце, не цярпяць ад аўтарскай прадузятасці. Шпіён Дзмітрый (які быццам з Мінска і размаўляе, па словах Гільерма дэль Тора ў адным з інтэрв'ю, «з мінскім акцэнтам») аказваецца здольным супрацьстаяць дзвюм сістэмам, паміж якімі ён апынуўся, каб захаваць жыццё «істоце» і дапамагчы яе выкрасці. У той час як сістэма кіруе Рычардам Стрыклэндам, але не праз прынцыпы і вернасць, а праз кар'ерызм.

У выніку да абедзвюх сістэм можа скласціся дваякае стаўленне, але над імі абедзвюма заўсёды будуць Элайза і амфібія.

Дарэчы, нягледзячы на сур'ёзнасць перакрыжаваных тэм — тут халодная вайна, гомасексуалізм, расізм, чалавек як частка сістэмы, нават супрацоўнікі, што застаюцца непатрэбныя праз развіццё тэхналогій і адпаведна змяненне фарматаў прадукцыі, — у Гільерма дэль Тора хапіла далікатнасці, лёгкасці і пачуцця гумару, каб паказаць гэта без асабістых ацэнак, дыскусійнасці і праблемнага флёру.

«Форма вады» — гэта ўсё роўна гісторыя кахання, прычым кахання безумоўнага, бо што можа быць агульнага паміж прыбіральшчыцай і чалавекам-амфібіяй. Але фон для гэтага кахання створаны скрупулёзна, рэалістычна і, што важна, свабодна ад страху выказацца некарэктна.

Дзеля Элайзы і «істоты», дзеля дзіўнай паміж імі цеплыні ў неверагодна прыгожых сцэнах і дзеля іх хэпі-энду варта пайсці ў кінатэатр, бо натуральна — такое кіно лепш глядзець на вялікім экране. Ацаніць новы фільм вялікага творцы кінасветаў Гільерма дэль Тора ў мінскім пракаце можна да 14 лютага.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

# Студэнцкае свята — Таццянін дзень

## Прысвячаецца студэнтам і ўсім Таццянам Беларусі



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1.** Старэйшая расійская навучальная ўстанова, дзе ўпершыню, у 1755 годзе, пачалі адзначаць свята студэнтаў, прысвечанае хрысціянскай пакутніцы Таццяне. **8.** Планета, заступніца ўсіх Таццян. **9.** «Адметная ... студэнта: не ведаў, але ўспомніў». Цытата невядомага аўтара. **10.** Тое, што і сцежка (разм.). **13.** «Люблю наш ... — старонку гэту, // Дзе я радзілася, расла». З верша «Люблю» К. Буйло; у студзені — 125 гадоў з дня яе нараджэння. **14.** ... — не хвароба, гады не аднімае (прык.). **15.** Пасаджаны гай з алеямі, кветнікамі. **18.** Сухі, рэзкі гук. **19.** Той, хто ідзе першы ў якім-небудзь спаборніцтве. **22.** Праца, твор (жарт.). **23.** Таццяна і ... пячэ, і палавікі на рацэ б'е, і карагод вядзе (прык.); лічылася, што жанчына, якая нарадзілася ў дзень Таццяны — добрая гаспадыня. **27.** Калі на Таццяну ідзе ... — лета будзе дажджлівае (прыкм.). **29.** Лабараторная пасудзіна. **31.** «Лепш мець сіні дыплом і чырвоны ..., чым чырвоны дыплом і сіні ...». Цытата невядомага аўтара. **32.** Бачыць ... далёка, а розум яшчэ далей (прык.). **33.** Сістэма падрыхтоўкі кадраў для вышэйшых навучальных і навукова-даследчых устаноў.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** Жарты. **2.** Рака, прыток Нёмана. **3.** Малады розум — палявы ...: бяжыць і гудзіць (прык.). **4.** Устаноўлены парадак чаго-небудзь. **5.** Мужчынскае імя. **6.** ... сястры; адна з беларускіх назваў сузор'я Арыён. **7.** Праца і ... — брат і сястра (прык.). **11.** Назва старажытнага студэнцкага гімна; у перакладзе з лацінскай мовы — «давайце радавацца». **12.** «Студэнт — гэта не ..., якую трэба запоўніць ведамі, а факел, які трэба запаліць». Л. Арцімовіч. **16.** «Запалю ў Таццянін дзень // ... Гіменея». З верша А. Карнева «Таццянін дзень». **17.** Розум не ..., у галаву не ўвальеш (прык.). **20.** Згубленае ... можна знайсці, згублены час — ніколі (прык.). **21.** Паляўнічая сумка. **24.** ..., або гушкалка. **25.** Індывідуум. **26.** Музычны твор для васьмі выканаўцаў. **28.** Вялікі гістарычны перыяд. **30.** ... салдаты — не войска, ... дубы — не дуброва (прык.).

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**

*г. Дзяржынск.*

**Праверце, калі ласка, адказы:**

**Па гарызанталі: 2.** Універсітэт. **8.** Марс. **9.** Рыса. **10.** Сцяжына. **13.** Край. **14.** Грамата. **15.** Парк. **18.** Трэск. **19.** Лідар. **22.** Опус. **23.** Каравай. **27.** Снег. **29.** Рэторта. **31.** Твар. **32.** Вока. **33.** Аспірантура.

**Па вертыкалі: 1.** Смешкі. **2.** Уса. **3.** Вецер. **4.** Рэжым. **5.** Ігнат. **6.** Тры. **7.** Навука. **11.** «Гаўдэамус». **12.** Пасудзіна. **16.** Факел. **17.** Кулеш. **20.** Золата. **21.** Ягдташ. **24.** Арэлі. **25.** Асоба. **26.** Актэт. **28.** Эра. **30.** Два.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.08 | 17.37 | 8.29 |
| Віцебск — | 9.03 | 17.21 | 8.18 |
| Магілёў — | 8.58 | 17.27 | 8.29 |
| Гомель — | 8.48 | 17.30 | 8.42 |
| Гродна — | 9.22 | 17.53 | 8.31 |
| Брэст — | 9.16 | 18.00 | 8.44 |

## Месяц

*Першая квадра 25 студзеня.*

*Месяц у сузор'і Цяльца*

## Імяніны

*Пр. Пятра, Савы, Таццяны.*

*К. Генрыха, Ірэны, Мілаша, Паўла, Таццяны, Эльвіры, Яны.*



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

# ЗАЎТРА






***Родную нашу, адзіную і непаўторную маці, бабулю і прабабулю — Вольгу Аляксандраўну СЦЯПУК шчыра віншуем з цудоўнай датай — 95-годдзем! Дзякуй за дабрыню, клопат, залатое сэрца, за тваю любоў, падтрымку і мудрую параду. Няхай гады і надалей не стараць цябе душою! Любім цябе і жадаем усяго сапраўды самага лепшага. Жыві доўга на радасць нам.***

***Твая сям'я — усе 23 чалавекі.***

*«Звязда» далучаецца да гэтага віншавання і жадае Вользе Аляксандраўне, героі адной з нашых публікацый, былой партызанцы, ветэрану працы і проста цудоўнаму чалавеку, здароўя, здароўя, здароўя!*

## Даты | Падзеі | Людзі

### 25 СТУДЗЕНЯ

**У краіне**

**1905** год — нарадзіўся Юрый Валянцінавіч Гулькевіч, беларускі вучоны ў галіне паталагічнай анатоміі, член-карэспандэнт АМН СССР, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. У 1930 годзе скончыў Іркуцкі універсітэт. З 1955 года выкладаў у Мінскім медыцынскім інстытуце. Аўтар навуковых прац па паталогіі баявых траўмаў, гісторыі паталагічнай анатоміі і інш. Памёр у 1974 годзе.

**1933** год — нарадзіўся Міхаіл Міхеевіч Пірагоў, заслужаны архітэктар Беларусі. З 1975 года працаваў галоўным архітэктарам інстытута «Белдзяржпраект», з 1978-га — кіраўнік майстэрні, а з 1988-га — галоўны архітэктар праектаў. Асноўныя работы ў Беларусі: інтэр'ер тэатра драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча ў Бабруйску, у Мінску — станцыі метро «Акадэмія навук» і «Плошча Якуба Коласа», Палац Рэспублікі і іншыя. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**У свеце**

**1913** год — нарадзіўся Іван Пятровіч Рыжоў, савецкі і расійскі кінаакцёр, народны артыст РСФСР. Здымаўся ў фільмах «Жывыя такі хлопец», «Еўдакія», «Цені знікаюць апоўдні», «Цыган» і многіх іншых. Памёр у 2004 годзе.

**1924** год — на паўднёвым усходзе Францыі ў Шамані, каля самага падножжа Манблана, адкрыліся міжнародныя спаборніцтвы пад назвай «Тыдзень зімовага спорту, прысвечаны маючай адбыцца VIII Алімпіядзе ў Парыжы». Менавіта гэтыя спаборніцтвы прынята лічыць першымі зімовымі Алімпійскімі гульнямі. Сюды з'ехаліся 258 спартсменаў (у тым ліку 13 жанчын) з 16 краін. Германію, як пачынальніцу Першай сусветнай вайны, да ўдзелу ў Гульнях не дапусцілі, таксама як не былыя саюзніцы, Аўстрыя і Венгрыя, запрашэнні атрымалі. Праграма мерапрыемства ў Шамані ўключала лыжны спорт, хуткасны бег і фігурнае катанне, а таксама хакей. У неафіцыйным камандным заліку ўсіх абышла Нарвегія, якая заваявала ўдвая больш ачкоў, чым фіны, якія занялі другое месца. Пасля заканчэння гэтых першых зімовых Гульняў прадстаўнікі ўсіх краін-удзельніц прызналі правядзенне зімовых Алімпіяд мэтазгодным і перспектыўным, а ў 1925 годзе МАК прыняў канчатковае рашэнне аб рэгулярным правядзенні зімовых Алімпійскіх гульняў.



**1938** год — 80 гадоў таму нарадзіўся Уладзімір Сямёнавіч Высоцкі, расійскі акцёр, паэт, аўтар і выканаўца песень. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1987, пасмяротна). Сыграў дзясяткі роляў у тэатры, у тым ліку Гамлета («Гамлет» У. Шэкспіра), Галілея ( «Жыццё Галілея» Б. Брэхта), Лапахіна («Вішнёвы сад» А. Чэхава). Зняўся ў фільмах «Месца сустрэчы змяніць нельга», «Маленькія трагедыі», «Інтэрвенцыя», «Гаспадар тайгі» і інш. Памёр у 1980 годзе.

## УСМІХНЕМСЯ

**Мужыкі, як куры: дваццаць метраў ад дома — і ўжо нічые.**

— Ці не падкажаце, як правільна дэкарываць тарталетку чорнай ікрой?

— Ды будзьце вы праклятыя!

**Артысты навагодняй праграмы строга дзеляцца на дзве групы: «Гэта наогул хто такі?» і «Божухна, ён яшчэ жывы?!».**

— Доктар, вы мне ўчора на ноч есці забаранілі, і я прастыла!

— А якая сувязь?

— Я ўсю ноч каля адкрытага халадзільніка прастаяла...



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 342.

Нумар падпісаны ў 19.30 24 студзеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12